ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 19 (4974) 18 мая 2018 г. ISSN 0024-4686

16+

Самотныя колеры Рыгора Сітніцы стар. 4

Красавіцкая квецень: агляды часопісаў стар. 6

Выбар Васіля Пешкуна стар. 13

Сапраўды адкрытая прастора

Фота БелТА.

Кніга — адзін з самых дзівосных культурных артэфактаў. З аднаго боку, гэта проста старонкі з друкаваным тэкстам, з іншага боку — кожная кніга жывая, бо мае сваіх стваральнікаў і чытачоў, непасрэдна суадносіцца з рэчаіснасцю альбо населена адухоўленымі героямі, якія могуць нават матэрыялізавацца ў прасторы і часе. Фестываль «Горад і кнігі» — выдатнае сямейнае свята, дзе кожная кніга — цікавая, яркая, гасцінная і жывая!

Фестываль праходзіць у Мінску ўжо чацвёрты раз (і другі раз — у дворыку Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта). Гэтым разам на фестывалі дзейнічае 5 вялікіх пляцовак, дзе адбываюцца самыя розныя кніжныя падзеі. Спектаклі, тэатралізаваныя чытанні, літаратурныя квэсты, выстаўка хэндмэйд-герояў з сучасных кніг — вось яна, цудоўная матэрыялізацыя літаратурных персанажаў!

Працяг на стар. 10 ►

Не спаць?!.

Запісаць жаданне пяром Якуба Коласа? Толькі падчас акцыі «Ноч музеяў»

Сёлета ў святкаванні Міжнароднага дня музеяў возьмуць удзел больш за сто дзяржаўных музеяў краіны. Чым заваблiваюць самыя знакавыя пляцоўкі Беларусі?

Працяг на стар. 3 ►

Фота Кастуся Дробава.

У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа падчас выстаўкі «І злучана быццё і небыццё», прысвечанай Міжнароднаму дню сям'і. Якуб Колас нарадзіўся ў вялікай сялянскай сям'і і сваё дзяцінства па-майстэрску, з асаблівай любоўю апісаў у славутай паэме «Новая зямля». Дарэчы, сёлета выдатнаму твору споўнілася 95 гадоў. Ён дапамагае сучасным дзецям зразумець вытокі творчасці народнага паэта і зразумець карані беларускай культуры.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 18019

Акцэнты тыдня:

краіна

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб уганараванні дзяржаўнымі ўзнагародамі 96 працаўнікоў розных сфер дзейнасці. Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны мастацкі кіраўнік хору духавенства Гродзенскай епархіі, протаіерэй Свята-Пакроўскага кафедральнага сабора Гродна Андрэй Бандарэнка; вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Таццяна Мдзівані; загадчык аддзела сучаснай беларускай мовы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Валянціна Русак.

Нацыянальная выстаўка Беларусі, адна з найбуйнейшых нацыянальных экспазіцый за апошнія гады, афіцыйна адкрылася ў сталіцы Таджыкістана Душанбэ. Чырвоную стужку ўрачыста перарэзалі прэзідэнты Беларусі і Таджыкістана Аляксандр Лукашэнка і Эмамалі Рахмон. Агульная плошча выстаўкі — 2 тыс. 233 кв. м. Удзел бяруць 147 арганізацый, у тым ліку рэспубліканскія органы дзяржкіравання і іншыя ўрадавыя арганізацыі. У выставачнай экспазіцыі сярод іншага прадстаўлены галіны навукі, адукацыі, кнігавыдання і паліграфіі. У Душанбэ і іншых гарадах краіны праводзяцца Дні культуры і кіно Беларусі ў Таджыкістане. Па асобнай праграме будуць працаваць прадстаўнікі беларускіх ВНУ. У Таджыкскім тэхнічным універсітэце адкрываюцца цэнтр беларускай прававой інфармацыі (афіцыйна пачаў працу 14 мая) і цэнтр беларускай мовы, культуры і адукацыі. Маюць быць падпісаныя дамовы на навучанне.

XXVII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску — 2018» пройдзе з 12 па 16 ліпеня. Дадатковыя мерапрыемствы запланаваныя на 7—11 і 17—18 ліпеня. Сёлета колькасць праектаў будзе значна большая, чым у мінулыя гады. Генеральны дырэктар Цэнтра культуры «Віцебск», дырэктар фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» Аляксандр Сідарэнка адзначыў, што ў аснове канцэпцыі гэтага года — тэма малой радзімы, а таксама значныя для форуму юбілейныя даты: 80-годдзе кампазітара, народнага артыста Беларусі Ігара Лучанка, 30-годдзе з даты правядзення фестывалю польскай песні і будаўніцтва Летняга амфітэатра. Плануецца вялікая колькасць выступленняў аркестраў: Эміра Кустурыцы, Горана Брэгавіча, «Фонограф-Симфо-Джаз» (канцэрт да Дня Саюзнай дзяржавы), Нацыянальны канцэртны аркестр пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, аркестр пад кіраўніцтвам Святланы Бязроднай, праект «Аркестр Мары» Алега Меньшыкава і шмат вулічных мерапрыемстваў з удзелам прыезджых аркестраў і музыкантаў.

Дні беларускага кіно пройдуць у Бішкеку ў Доме кіно імя Чынгіза Айтматава 21—23 мая. У праграме — паказ фільмаў «Настасся Слуцкая», «Сляды на вадзе», «Зоркі сёмага неба», «Ваўкі». Урачыстае закрыццё плануецца адзначыць дэманстрацыяй стужак «Кіндэр-Вілейскі прывід», «Масакра», «Ронда-капрычыёза».

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося адкрыццё фотапраекта «Я сэрцам бачу», арганізаванага тэлеканалам «Беларусь 24», і інфармацыйна-дакументальнай выстаўкі з фондаў НББ «Тутэйшыя». Фотапраект і выстаўка — другі этап выставачнага праекта «Малая радзіма — аповесць часоў». Беларусь, якая імкліва развіваецца, але нязменна шануе традыцыі, розная ў сваіх праявах і краявідах. Разгледзець гэта і паказаць прыгажосць радзімы іншым можа толькі той, хто здольны бачыць сэрцам. Прадстаўленыя фотаздымкі — самыя каларытныя работы вядомых фотамайстроў краіны: Станіслава Багдзевіча, Ігара Бышнева, Сяргея Плыткевіча, Максіма Мікешына, Сяргея Тарасава, Мікіты Церахава, Аляксандра Меклера. Інфармацыйна-дакументальная выстаўка «Тутэйшыя» знаёміць са знакамітымі беларусамі, якія праславіліся як у сябе на радзіме, так і за яе межамі.

Агляд афіцыйных падзей ад Наталлі НАРУТОВІЧ

Даўжэй за век

Не знікае цікавасць да творчасці Айтматава, сведчаць перавыданні па-беларуску

Калі больш, чым 30 гадоў таму Міхась Стральцоў пераставараў па-беларуску раман кіргізскага народнага пісьменніка Чынгіза Айтматава «Буранны паўстанак. І вякуе дзень даўжэй за век», наўрад ці ён думаў аб тым, што кніга будзе перавыдавацца яшчэ. Што агульнага паміж народамі дзвюх дзяржаў? Зусім розныя прырода, мовы... Але пачуцці, думкі, праблемы — аднолькавыя. Таму факт перавыдання рамана не здзіўляе. Сёлета ён ізноў пабачыў свет — у выдавецтве «Народная асвета». Ініцыявала падзею Пасольства Кыргызстана ў Рэспубліцы Беларусь, падтрымала — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Прымеркавана перавыданне кнігі да 90-гадовага юбілею пісьменніка і да 25-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж краінамі.

Фота Кастуся Дробава.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кыргызскай Рэспублікі ў Беларусі Кубанычбек Амураліеў.

Чынгіз Айтматаў з тых пісьменнікаў, каго адразу заўважылі беларускія перакладчыкі. Першыя яго кнігі, пераствораныя па-беларуску, з'явіліся ў айчынным друку ў канцы 1960-х — пачатку 1970-х гадоў. Аматары творчасці пісьменнікагавораць: калі Чынгісхан скараў народы мячом, то Чынгіз Айтматаў — пяром. Яго творы перакладзены на 150 моў свету.

— Выхад і прэзентацыя рамана Айтматава — знакавая падзея ў развіцці беларуска-кіргізскіх дыпламатычных зносін, — зазначыў міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч. — Кніга заўжды з'яўляецца мастом, які яднае дзяржавы і народы. І праблемы, да якіх звяртаецца пісьменнік, — агульныя.

Важнае месца ў рамане займае легенда пра маці Найман-Ана і яе сына, якога ворагі зрабілі манкуртам. Ён не памятаў сваіх каранёў. Сёння паняцце «манкурт» гучыць актуальна. Манкурты ёсць у любым народзе. Перакладаючы раман на беларускую мову, Міхась Стральцоў адчуваў сваю адказнасць, каб на нашай зямлі манкуртаў не было.

Памятаць сваю радзіму, маці, родных — гэтаму вучыць творчасць Чынгіза Айтматава. Яго шануюць, любяць, чытаюць творы ва ўсім свеце, аб чым сведчыла вялікая колькасць гасцей на прэзентацыі рамана: ад прадстаўнікоў дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь, міністэрстваў і ведамстваў да простых чытачоў.

Яна БУДОВІЧ

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

«ПРАГРАМНЫЯ» ПЫТАННІ

Рускамоўныя літаратары гатовыя да сустрэч у ВНУ

Цікавасць да літаратуры і чытання ў многім залежыць ад таго, хто і як прадставіць прыгожае пісьменства, якімі аўтарамі і творамі зацікавіць аўдыторыю. З ініцыятывы Саюза пісьменнікаў Беларусі тэмай абмеркавання на адмысловым круглым стале стала выкладанне сучаснай рускамоўнай літаратуры ў вышэйшых навучальных установах краіны. З гэтай нагоды ў Доме літаратараў сабраліся прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кафедры рускай літаратуры БДУ, кафедраў літаратуры абласных універсітэтаў, вядомыя беларускія пісьменнікі.

Рускамоўная літаратура мае важкую долю ў тыражах беларускіх выдавецтваў (16,2 % у 2016 г. і 17,1% у 2017 г.), кнігі многіх беларускіх рускамоўных аўтараў выдаюцца ў Расіі. Тым не менш у вучэбных праграмах ВНУ літаратура такога кшталту прадстаўлена мізэрна. Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец выказаў думку, што гэта адмоўна ўплывае на развіццё светапогляду моладзі.

Пісьменнікі гаварылі пра важнасць цеснага супрацоўніцтва з навучальнымі ўстановамі, дзе яны рады праводзіць больш сустрэч і атрымліваць ад спецыялістаў-літаратуразнаўцаў крытычныя заўвагі на новыя выданні. Відавочная неабходнасць глыбокага вывучэння творчасці найбольш значных рускамоўных аўтараў айчыннымі літаратуразнаўцамі. На думку Вольгі Лапацінскай, загадчыка кафедры літаратуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. Машэрава, неабходна распрацоўваць аўтарскія курсы па сучаснай рускамоўнай літаратуры. Творчасць сучасных рускамоўных пісьменнікаў можа стаць прадметам напісання курсавых, дыпломных, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Па выніках круглага стала, Саюз пісьменнікаў Беларусі накіраваў міністру адукацыі Рэспублікі Беларусь І. В. Карпенку ліст з прапановай стварыць пры Міністэрстве адукацыі рабочую групу па падрыхтоўцы рэформы праграм вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, якія рэгламентуюць выкладанне рускамоўнай літаратуры ў Беларусі.

Марыя ЛІПЕНЬ

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

18 мая *— на сустрэчу Міхася Пазнякова з чытачамі, прысвечаную Году малой радзімы, у Дом культуры г. Быхава (а 12.30).*

21 мая *— на ўрок мужнасці з удзелам паэта-франтавіка Мікалая Іванова ў Мемарыяльную залу Дома літаратара (а 15.00).*

21 мая *— на свята дзіцячай кнігі ў публічную бібліятэку № 21 (а 14.00).*

22 мая *— на прэзентацыю зборніка беларускай паэзіі «На земле вековечной» у перакладзе на рускую мову Лізаветы Палеес у СШ № 168 (а 14.00).*

22 мая *— на пасяджэнне літаратурнага клуба «Аўтограф» пры інтэрнаце № 8 БДЭУ (а 17.00).*

22 мая *— на гала-канцэрт беларускай паэзіі і ўрачыстую цырымонію ўзнагароджання лаўрэатаў гарадскога конкурсу чытальнікаў паэзіі Беларусі «Радзіма мая дарагая» ў Цэнтральную гарадскую бібліятэку імя Янкі Купалы (а 17.00).*

23 мая *— на паэтычна-песенную імпрэзу «Калі каханнем поўніцца душа…» у Мінскі гарадскі тэатр паэзіі пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы (а 18.00).*

24 мая *— на пасяджэнне клуба творчых жанчын «Спадарыня» (ганаровы госць — заслужаная артыстка Беларусі Ірына Нарбекава) у Музей тэатральна-музычнага мастацтва (а 15.30).*

24 мая *— на сустрэчу з Мікалаем Івановым у літаратурны клуб «Парнас» пры публічнай бібліятэцы № 5 (а 17.30).*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

22 мая *— на пасяджэнне Школы маладога літаратара ў офіс Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ (а 17.00).*

23 мая *— на сустрэчу Зінаіды Дудзюк з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў цэнтр Уладзіміра Калесніка Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (а 10.00).*

24 мая *— на святочную імпрэзу, прымеркаваную да Дня славянскай пісьменнасці і культуры, у Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр (а 15.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

22 мая *— на сустрэчу Тамары Красновай-Гусачэнкі з вучнямі 2 класа ў Віцебскую гарадскую бібліятэку імя Л. Талстога (а 13.30).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

19 мая *— на абласны этап Рэспубліканскага творчага конкурсу чытальнікаў «Жывая класіка» з удзелам пісьменнікаў у Гродзенскі абласны палац творчасці дзяцей і моладзі (а 10.00).*

20 мая *— на чарговую сустрэчу ў межах грамадска-літаратурнай акцыі «Творы і творцы» з удзелам Вікторыі Смолкі ў Гродзенскую абласную навуковую бібліятэку імя Я. Ф. Карскага (аб 11.00).*

22 мая *— на сустрэчу з польскімі паэтамі Аляксандрам Наўроцкім і Барбарай Юркоўскай у межах прэзентацыі польска-беларускай анталогіі паэзіі «Масты: Гродна — Варшава. Варшава — Гродна» ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (а 12.00).*

22 мая *— на сустрэчу з Ганнай Скаржынскай-Савіцкай у Гродзенскі дзяржаўны музей Максіма Багдановіча (аб 11.00).*

24 мая *— на чарговае пасяджэнне грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром» у Гродзенскую абласную навуковую бібліятэку імя Я. Ф. Карскага (а 17.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

19 мая *— на сустрэчу Марыны Сліўко з навучэнцамі Магілёўскага політэхнічнага каледжа (а 13.30).*

21 мая *— на сустрэчу Мікалая Барысенкі з чытачамі «Час не мае ўмоўнага ладу» ў Магілёўскую абласную бібліятэку (а 13.00).*

23 мая *— на сустрэчу Валянціны Габрусёвай з навучэнцамі Магілёўскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. А. Рымскага-Корсакава (а 14.00).*

22 мая *— на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Магія слова» ў Магілёўскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна (а 18.00).*

24 мая *— на сустрэчу Алеся Казекі, Марыны Сліўко і супрацоўнікаў газеты «Магілёўская праўда» з творчай інтэлігенцыяй у Магілёўскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна (а 17.30).*

КУРС НА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ

Міністэрства інфармацыі і Беларускі саюз мастакоў падпісалі Пагадненне аб супрацоўніцтве

Прадстаўнікі творчай супольнасці Беларусі зацікаўленыя ў больш актыўнай папулярызацыі культурных падзей, якія адбываюцца штодня. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускі саюз мастакоў паспрабавалі вырашыць сітуацыю. У прэс-цэнтры Дома прэсы міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч і старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца падпісалі Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж двума структурамі і аб'явілі старт Рэспубліканскага творчага конкурсу на лепшае асвятленне ў СМІ тэмы мастацтвазнаўства і мастацкай крытыкі.

Міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч і старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца.

— У Міністэрства інфармацыі і Беларускага саюза мастакоў ёсць цэлы комплекс мерапрыемстваў, дзе мы хацелі б працаваць разам, — падкрэсліў міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч. — Нядаўна пры актыўным удзеле сродкаў масавай інфармацыі краіны мы прыцягнулі грамадскасць да конкурсу на талісман II Еўрапейскіх гульняў. Спадзяёмся, што ідэю талісмана, яго мастацкае выкладанне будуць развіваць прафесіяналы Саюза мастакоў. Акрамя пагаднення, мы аб'явілі Рэспубліканскі конкурс на лепшае асвятленне тэмы выяўленчага мастацтва. Вынікі конкурсу будзем падводзіць у лютым 2019 года.

На конкурс прымаюцца матэрыялы, апублікаваныя ці паказаныя ў эфіры на працягу 2018 года. Конкурс ладзіцца сярод журналістаў друкаваных, электронных сродкаў масавай інфармацыі, інтэрнэт-рэсурсаў. Удзельнікамі таксама могуць быць прафесійныя мастацтвазнаўцы, аўтары даследаванняў у галіне выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і арт-дызайну. Запрашаюцца як асобныя аўтары, так і калектывы аўтараў. Прадугледжаны грашовыя прэміі.

Пераможцы будуць вызначацца ў чатырох намінацыях: «За шматгадовы прафесійны ўклад у галіне нацыянальнага мастацтвазнаўства і мастацкай крытыкі», «За лепшы крытычны аналіз і асвятленне ў сродках масавай інфармацыі значнага мастацкага праекта», «За мастацтвазнаўчае даследаванне творчай дзейнасці мастака» і «За навуковую працу ў галіне мастацтвазнаўства».

— Пагадненне, якое Беларускі саюз мастакоў падпісаў з Міністэрствам інфармацыі, павінна даць шырокаму грамадству разуменне тых мастацкіх працэсаў, якія адбываюцца ў краіне, — падкрэсліў Рыгор Сітніца. — Мы б хацелі, каб пра нашу творчасць ведалі болей. У Беларусі мала мастацкай аналітыкі. Нам патрэбна, каб крытыкі, журналісты, мастацтвазнаўцы дапамаглі асэнсаваць нашу творчасць у кантэксце гістарычнасці, сучаснасці, каб мастакі арыентаваліся на заўвагі і разумелі, куды ім рухацца далей.

Вікторыя АСКЕРА,
фота аўтара

Не спаць?!.

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь заклікае паўдзельнічаць у праграме «Форма колераў». Музей прапануе гасцям наведаць чатырнаццаць лакацый, дзе колер падкрэслівае не толькі важныя ідэі жывапісу, але і становіцца абліччам кожнай пляцоўкі. Паглыбленне ў фарбы — стратэгічная мэта дапамагчы гледачам зразумець асаблівасці колераў і іх грандыёзныя магчымасці ў розных светлавых умовах. Акрамя жывапісных твораў, наведвальнікаў чакаюць харэаграфічныя пастаноўкі, электронныя імправізацыі, лічбавыя пляцоўкі, а таксама лекцыі знакамітых мастацтвазнаўцаў.

У **Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі** прапануюць згуляць у косці з Вітаўтам і Ягайлам, расшыфраваць піктаграмы з першабытным чалавекам і атрымаць «безназоўную» кнігу ад загадкавага гандляра, выканаўшы заданне. Таксама музей абяцае ажывіць ілюстрацыі Сальвадора Далі да «Боскай камедыі» Дантэ Аліг'еры. А ва ўнутраным дворыку наведвальнікаў чакаюць выступы музычных бэндаў і кірмаш падарункаў ручной работы.

У **Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў** будзе працаваць інтэрактыўная лабараторыя адчуванняў, дзе можна пагуляць з успрыманнем мастацтва (нават адчуць водар нацюрмортаў!), а таксама музычная лабараторыя. Ноччу гасцям прапануюць «змрочную музыку»: новы альбом праекта *Diewtodsi* і беларускае кантры «*Sinie Gory*» Дзяніса Кудраўцава.

Сёлета **Музей гісторыі горада Мінска** вырашыў парадаваць наведвальнікаў гіперквэстам «Музейны дэтэктыў», які дазволіць наведаць 7 музеяў за адну ноч. Удзельнікі будуць шукаць каштоўны прадмет і доказы злачынства, якія выкрадальнік пакінуў у некалькіх месцах у Верхнім горадзе. Пераможцу чакае цікавы прыз — рамантычнае спатканне на дваіх на даху а дванаццатай гадзіне ночы. А дэтэктывы, якія зойміуць другое месца, атрымаюць магчымасць узняцца на Мінскую ратушу.

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запрашае ўзяць удзел у гульні «Метамарфозы», падчас якой самыя адважныя будуць адкрываць таямніцы ператварэнняў музейных экспанатаў і выконваць заданні на шляху да запаветнай узнагароды — прыза шукальніка. Астатнія змогуць паспяваць у караоке і патанцаваць пад песні ваенных гадоў.

Галерэя «Арт-Беларусь» прапануе пазнаёміцца з творамі асноўнай экспазіцыі праекта «Арт-Мінск» праз прызму музыкі. Абяцаюць шмат музычнай імправізацыі ад праекта *Maximalism*, а таксама прэзентацыю праекта «Сінэстэзія», зробленага сумесна з маскоўскай камандай «Эстэтыка гуку».

Праграма ў **Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа** будзе прысвечана 100-годдзю выдання паэмы «Сымон-музыка» і 95-годдзю выдання паэмы «Новая зямля». Так, падчас Ночы музеяў прадугледжана сустрэча з землякамі Якуба Коласа. Будзе праводзіцца «магічны рытуал»: ахвотныя змогуць запісаць сваё жаданне за сталом Якуба Коласа ўласным пяром паэта: зрабіць гэта можна раз у год.

Адчуць сябе ўдзельнікам музейна-тэатральнай дзеі зможа кожны, хто завітае ў **Літаратурны музей Максіма Багдановіча**. Убачыце батлейку, тэатр часоў Максіма Багдановіча, а таксама паспрабуеце сябе ў ролі акцёра, што знаёміцца са сцэнарыем, рэпеціруе, робіць грым і вось-вось выйдзе на сцэну.

Літаратурны музей Янкі Купалы прапануе стаць удзельнікамі містэрыі «Сон на кургане», абяцаючы сустрэчу з героямі беларускай міфалогіі. Таксама ў праграме — выстаўка «Булгакаў — з'ява незаконная» і выступленні музычных калектываў «*Dzivasil*», «*Aratsea*», «*Ketri*» і «*Shaman jungle*».

Вікторыя АСКЕРА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

18 мая 80-годдзе святкуе Міхаіл Казінец, дырыжор, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, народны артыст БССР.

18 мая 20 гадоў таму (1998) адкрыты Музей сучаснага выяўленчага мастацтва (заснаваны ў 1997 г.).

20 мая — 95 гадоў з дня нараджэння Анатоля Кузьмічова (1923—2011), беларускага празаіка, драматурга. Пісаў на рускай мове.

20 мая — 95 гадоў з дня нараджэння Івана Міхайлавіча Сталярова (1923—2015), беларускага мастака-акварэліста, графіка, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

20 мая 80-годдзе адзначыць Алена Шастоўская, жывапісец.

21 мая — 115 гадоў з дня нараджэння Апанаса Атавы (сапр. Кананові; 1903—1962), паэта.

21 мая — 110 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Даўтялы (1908—1978), жывапісца.

21 мая — 90 гадоў з дня нараджэння Івана Козела (1928—1970), драматурга.

22 мая 90 гадоў спаўняецца Дзіне Кухаравай, дзеячу тэатральнага аматарскага мастацтва, заслужанаму работніку культуры Рэспублікі Беларусь.

22 мая — 85 гадоў з дня нараджэння Рычарда Бутвілоўскага (1933—1977), кампазітара.

22 мая 80 гадоў адзначае Марыя Жабінская, мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, мастацтвазнаўца.

ЛіМ КАЛЯНДАР

22 мая 70-годдзе святкуе Мікалай Бушчык, жывапісец.

22 мая — 70 гадоў з дня нараджэння Сяргея Палякова, мастака манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, жывапісца, графіка.

24 мая — 100 гадоў з дня нараджэння Мікалая Шошчыца (1918—1996), дзеяча самадзейнага мастацтва, педагога, заслужанага артыста БССР.

24 мая — 95 гадоў з дня нараджэння Анатоля Марозава (1923—1994), беларускага і расійскага мастака тэатра.

24 мая — 90 гадоў споўніцца Івану Панчанку, празаіку, нарысісту.

Люстэрка тыдня: свет

Міжнародны дзень сям'і адсвяткавалі і ў Беларусі. У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылася выстаўка «І злучана быццё і небыццё». Першая частка экспазіцыі праз яркія ілюстрацыі Васіля Шаранговіча, Лазара Рана, Ільі Немагая і Эдуарда Агуновіча да «Новай зямлі» распавядае пра сям'ю бацькі Песняра Міхала Міцкевіча. Тэматычны блок сям'і Міцкевічаў другога пакалення прадстаўлены фотаздымкамі самога Якуба Коласа, яго жонкі і сыноў, ліставаннямі паэта са сваімі блізкімі. А ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры сёння завяршаецца акцыя «Мая сям'я ідзе ў музей». Вас запросяць на фэст «Гулянне ў народным стылі», на выстаўку букваро́ў, інтэрактыўную экскурсію «Падарожжа ў краіну маленства. Янка Маўр і дзіцячая літаратура», сустрэчу з пісьменнікам Анатолем Зэкавым і інш.

Штогод на Міжнародны фестываль літаратуры і кніжны кірмаш *Book World Prague* (Свет кнігі) у Празе (а гэта адна з самых значных падзей такога кшталту ў Чэхіі) прыязджаюць прадстаўнікі больш як 30 краін, праводзіцца каля 400 лекцый, гутарак і майстар-класаў. Падчас сустрэчы беларускіх кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў з дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Чэхіі Марцінам Коцандам і дырэктарам Славянскай бібліятэкі Нацыянальнай бібліятэкі Чэхіі Лукашам Бабкам для папулярызацыі культурнай спадчыны Беларусі Нацыянальнай бібліятэцы Чэхіі было перададзена звыш 120 кніг айчынных выдавецтваў. У сваю чаргу Лукаш Бабка падараваў прадстаўнікам беларускага боку кнігу вершаў Максіма Багдановіча, выдадзеную летась на чэшскай мове.

Спецыялісты Нацыянальнага інстытута антрапалогіі і гісторыі Мексікі разам з іспанскімі калегамі распрацоўваюць першы 3D-каталог будынкаў, узведзеных цывілізацыяй мая на паўвостраве Юкатан. Для стварэння ўнікальнага рэестра ў трохмерным фармаце будуць зроблены тысячы высакаякасных фатаграфій, з дапамогай якіх створаць віртуальныя мадэлі архітэктурных аб'ектаў. Гэта дазволіць не толькі дэталёва даследаваць старажытныя будынкі, але і ўявіць, як яны выглядалі першапачаткова. Выкарыстоўваючы віртуальныя мадэлі, навукоўцы змогуць зразумець і задумку дойлідаў. Першым будынкам, унесеным у 3D-каталог, стане Палац Правіцеля ва Ушмале (адна з галоўных славутасцяў Мексікі), збудаваны прыблізна ў 980 годзе н. э.

Кумранскія рукапісы або скруткі Мёртвага мора, якія доўгі час лічыліся «пустымі», у сапраўднасці могуць быць пакрытыя нябачным тэкстам, лічаць навукоўцы. Паводле Орэна Эйблмана з Міністэрства па справах старажытнасцяў Ізраіля, манускрыпты, магчыма, утрымліваюць апісанне правіл служэння ў храме і невядомы экспертам варыянт псалмоў. Старажытныя скруткі знайшлі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя пастухі-бедуіны ў кумранскіх пячорах. Артэфакт неўзабаве стаў сапраўднай сенсацыяй для сусветнай супольнасці. Сярод тэкстаў, якія на іх запісаныя, — фрагменты старазапаветных кніг, біблейскія апокрыфы і жыццяпіс іўдзейскай секты ясеяў.

Юныя таленты з Расіі, Украіны і Беларусі бралі ўдзел у гала-канцэрце, які ладзіўся падчас свята мастацтваў «У будучыню — з надзеяй!». Творчая праграма «Таленты малой ра-дзімы» была прадстаўлена ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Яе галоўнымі героямі сталі дзеці і падлеткі з раёнаў Брэсцкай, Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцей, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Маладыя галасы з трох краін завіталі таксама з дабрачыннай канцэртнай праграмай у дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Ждановічы».

Агляд цікавінак ад Раісы МАРЧУК

Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі выказвае шчырыя спачуванні члену СПБ Зінаідзе Іосіфаўне Дудзюк з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МАЦІ.

Землякі

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

СВІТАЮЦЬ АКВАРЭЛІ МАЙСТРА

Яны празрыстыя, як вецер,
Імклівыя, нібы страла.
Нібы прыроды ўсёй суквецце
Папера тонкая ўзяла…

Гэта з майго даўняга верша «Акварэлі». Здаўна палюбіў я гэты від жывапісу, у многім дзякуючы маім сябрам-мастакам.

Бяру з кніжнай паліцы альбом «Беларуская акварэль». 14 студзеня 1980 года мне яго з дарчым надпісам прэзентаваў мастак Віктар Лук'янаў. Я тады працаваў на заводскім радыё ў Наваполацку, па вечарах у гарадской газеце наведваў легендарнае цяпер літаб'яднанне «Крыніцы», а Віктар быў ужо вядомы мастак, і ў альбоме на 111-й старонцы была змешчана рэпрадукцыя яго работы «Зямля. Наваполацк». А суседства новапалачаніна ў альбоме было не абы-якое: Гаўрыіл Вашчанка, Святлана Каткова, Барыс Аракчэеў, Зоя Літвінава, Генадзь Шутаў, Фелікс Гумен, Віктар Ральцэвіч, Пятро Драчоў…

Лук'янава ў Наваполацку паважалі і цанілі. Увогуле, з яго лёгкай рукі праца мастакоў у горадзе была запатрабаваная. І яны з ахвотай прымалі заказы на афармленне самых розных аб'ектаў. Гэта была не халтура, а сапраўды высокапрафесійныя работы. І сёння гараджане могуць ганарыцца скульптурамі Аганава, мазаікамі і насценнымі роспісамі Шапо, Лук'яненкі, Куржалава, Іванова, Дзмітрыева, Пацэвіча, Стасевіча, Канавалава…

А майстэрня Віктара Лук'янава ў цэнтры горада на вуліцы Маладзёжнай была і выставачнай залай, і гасцёўняй, і творчай лабараторыяй. І я не раз, убачыўшы ветлы агеньчык за масіўнымі шторамі, стукаўся ў дзверы, і мне адчыняў сам гаспадар. Сярод гатовых і няскончаных акварэляў, засушаных дзьмухаўцоў у вазах, магутных ляшчоў на сценках (Віктар быў выдатным і заўзятым рыбаловам) мы гутарылі пра ўсё: і пра мастацтва, і пра будзённыя справы, ды і пра розныя цікавыя гісторыі, на што здатныя толькі апантаныя вудары…

Праходзілі гады, нехта пакідаў горад, некага заваблівалі новыя творчыя і жыццёвыя абсягі, а ў Віктаравай майстэрні па-ранейшаму па вечарах часам да позняй ночы гарэла святло і гасціла высокае натхненне. Яго не парушала ні прысваенне звання ганаровага грамадзяніна горада, ні жыццёвыя клопаты, ні рыбацкія вандроўкі.

Я б хацеў пабываць на прэзентацыі яго твораў у Полацкай карціннай галерэі, але, на жаль, не ведаў раней пра гэтую падзею, ды і не ведаю, ці змог бы вырвацца на яе. Але ў думках сардэчна абдымаю і моцна цісну руку майстру і выдатнаму чалавеку.

Хай свецяцца яго акварэлі, як і заўсёды, беларускай спагадай і дабрынёй, светлымі і чыстымі фарбамі!..

Трагічная бясконцасць беларускага паркана

Рыгор Сітніца любіць шумныя кампаніі, прэзентацыі, прэм'еры. Але ў яго карцінах заўсёднае бязлюддзе.

Ён чалавек эмацыянальны, рухавы, гучны. У той час, як геаметрычна-дасканалыя графічныя творы мастака напоўнены статыкай і маўчаннем.



Вялікі прыхільнік савецкага мастацтва (канструктывісты, супрэматысты, Дайнека, Штэрнберг, Майсеенка), ён эмацыянальна блізкі амерыканскім класікам Эндру Уаету і Эдварду Хоперу.

Кінематаграфічна-халодны жывапіс Хопера тоесны Сітніцу сваёй адцягненай нардычнасцю, а знакаміты самотнік Уает захапляе амаль гіперрэалістычнай прамаляванасцю, напоўненай меланхалічнай паэзіяй, гэтак уласцівай ранняй прозе Кузьмы Чорнага, якую так любіць чытаць спадар Рыгор, калі заканчвае свой чарговы твор.

«Святло адвечнае I». Папера, каляровыя алоўкі, 1996 г.

Але Сітніца захапляецца Уаетам не толькі з-за духоўнай еднасці амерыканца з аўтарам раманаў «Сястра» і «Зямля». Эндру Уает, які ўсё жыццё пражыў на сваім ранча і маляваў толькі яго ваколіцы, ні разу не паўтарыўся, стварыў кампазіцыйна насычаны, унікальны свет, дзе вонкава простыя і нават банальныя ў сваёй штодзённасці рэчы набываюць нечаканае значэнне.

Такі творчы падыход вельмі блізкі і спадару Рыгору. Пераканаемся ў гэтым, гартаючы фотаальбом «Рыгор Сітніца. Простыя рэчы» (Выдавецкі дом «Звязда», 2017), прысвечаны творчасці мастака і паэта.

Адзін з пастаянных «герояў» карцін Сітніцы — бясконцы, дасканала прамаляваны паркан, які знікае за межамі графічнага ліста і мы не бачым ні яго пачатку, ні завяршэння. Паркан успрымаецца своеасаблівым абярэгам: ратуе гарманічны, ледзьве не пад лінейку створаны свет Рыгора Сітніцы ад хаосу і бязладдзя (серыя «Шпацыр уздоўж паркана»).

Звычайная драўляная хата (серыя «Новы дом»), дзякуючы ракурсам у стылі Родчанкі і акцэнтацыі на вобразе трохкутніка (шчыт хаты), ператвараецца ў храм. Сітніца любіць насычаць сваю графічную гасподу пэўнай сакральнасцю, нават назвы некаторым сваім серыям дае адпаведныя, напрыклад «Святло адвечнае». На адной з карцін з гэтай серыі гурба бульбы больш нагадвае дасканалую піраміду ці той жа трохкутнік. А на шматлікія замкі, цэрквы, фрагменты ўмацаванняў даволі часта падае з неба сімвалічны прамень святла, як быццам нехта ўключыў велізарны пражэктар.

Эндру Уает баяўся падобнага літаратурнага сімвалізму і ўсяляк яго пазбягаў. Як, дарэчы, і многія іншыя любімыя мастакі Рыгора Сітніцы.

Але ў творах героя нашага артыкула падобная зададзенасць амаль не кідаецца ў вочы. І, нават калі бачыш на яго карціне тую ж бульбу, захапляешся не тым, што яна складзена пірамідай, а іншым: як можна пры дапамозе звычайных каляровых алоўкаў дамагчыся эфекту, быццам бульба і на самай справе свеціцца!

У некаторых сваіх работах Сітніца і зусім забываецца на ўсялякую «ідэйнасць», «літаратурнасць». Сярод такіх твораў можна безумоўна назваць яго «Безназоўнае». Памятаю, як на выстаўцы суполкі «Пагоня» ў 1999 годзе многія былі здзіўлены, калі ўбачылі гэту карціну.

На той час глядач ужо прывык, што Сітніца малюе выключна гіперрэалістычныя платы, хаты, замкі ды іншую архітэктуру, напоўненую філасофскім сэнсам, ператвораную ў знак.

І раптам перад намі было выстаўлена каляровасычанае, ярка-зялёнае палатно, без аніякага «літаратурнага» зместу, ніякай нардычнасці і глыбакадумнай сузіральнасці! Усяго толькі тры цудоўна скампанаваныя, намаляваныя акрылавай фарбай лапікі гароду. Колер, кампазіцыя, пэўная хуліганістасць, з якой было выканана гэтае «Безназоўнае», здзіўлялі, інтрыгавалі, цвялілі, дражнілі, натхнялі.

Адразу прыгадалася папярэдняя графічная серыя «Ратаванне Грэцыяй» (1997 г.), дзе іншыя краявіды, паветра, пластыка і рытміка дыктавалі мастаку другі творчы падыход. Менавіта ў гэтай серыі Сітніца ўпершыню для сябе пачаў актыўна выкарыстоўваць яркі колер, а грэчаская весялосць і бесклапотнасць эмацыянальна перадаліся яго творам і пазбавілі нават намёку на дэкларатыўнасць.

Тым не менш у далейшым мастак ізноў вярнуўся да свайго традыцыйнага стылю. Некаторыя творы (і па колеры, і па настроі) набывалі цалкам уаетаўскае гучанне (як, напрыклад, «Гаспода № 9», «Гаспода № 10»), некаторыя («Шпацыр уздоўж паркана 8») былі творчымі паўторамі яго шэдэўраў 1990-х гадоў.

Але два гады таму зноў пачаўся час эксперыментаў.

Яго новыя парканы па-ранейшаму такія ж бясконцыя і бязмежныя, але пачала паціху знікаць геаметрычная «правільнасць», забыты аловак (замест яго — акрыл), няма «боскага» пражэктарнага святла.

Перад намі трагічныя па колеры, змрочна-невясёлыя, нават з'едлівыя паводле настрою палотны, дзе тужлівая рытміка вертыкаляў платоў настройвае на трывожны лад. Гэтыя платы ўжо не аберагаюць, яны душаць, наступаюць, хочуць захапіць у свае іржава-жалезныя абдымкі, каб не выпусціць, не паказаць таго, што хаваюць ад нас.

Песімістычныя ноткі ўзмацняюцца яшчэ і тым, што ўзнікае такое адчуванне, быццам за гэтымі платамі нічога добрага, па сутнасці, і няма. Толькі свінцовае неба з каменнымі сценамі і будынкамі («Шпацыр уздоўж паркана 12», «Шпацыр уздоўж паркана 14») альбо ўвогуле суцэльная цемра («Шпацыр уздоўж паркана 13»).

Калі глядзіш на гэтыя палотны, то міжволі згадваеш радкі Якуба Коласа:

Кругом тупік, сцяна глухая.
Ні ценю спогадзі жывой.

Якуб Колас напісаў гэта ў 60 гадоў. Менавіта ў такім узросце пачаўся новы ўзлёт яго творчасці. Стома, расчараванасць, пачуццё адзіноты надалі паэзіі новае абвострана-тужлівае гучанне. Паказалі нам нечаканага Якуба Коласа.

Нешта падобнае цяпер адбываецца і з творчасцю (таксама 60-гадовага!) Рыгора Сітніцы, мастака, які ўмее здзіўляць і чые творы даўно ўжо занялі ганаровае месца сярод карцін Родчанкі, Уаета, Дайнекі ды іншых духоўных настаўнікаў і сяброў спадара Рыгора.

Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК

КАЛОССЕ ПРОЗЫ ІВАНА КАНАНОВІЧА

Рабочы клас мог бы ганарыцца. На сёння ці не адзіны ў Беларусі аўтар адметных твораў так званай вытворчай тэматыкі вядомы пісьменнік Іван Канановіч адзначае 80-гадовы юбілей. А нарадзіўся ён 10 мая 1938 года ў вёсцы Кукавічы Капыльскага раёна. Скончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, працаваў трактарыстам на цаліне, слесарам на Мінскім аўтазаводзе, журналістам, больш як два дзесяцігоддзі — рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». Проза Івана Канановіча глыбока псіхалагічная і створаная на крутых пераломах эпохі. У дасканалых па-мастацку аповесцях і апавяданнях слынны празаік з веданнем справы даследуе і аналізуе супярэчлівыя сацыяльныя і этычныя праблемы сучаснасці.



Фота Кастуся Дробава.

Нездарма кажуць: час ляціць — як вада плыве. Здаецца, зусім нядаўна, хоць было гэта ў сярэдзіне шасцідзясятых, я, тады і сам яшчэ малады журналіст ляхавіцкай раённай газеты, не адзін раз блукаў у ваколіцах вёсак Падлессе, Жарабковічы, Сваятычы, Гулічы, нават не здагадваючыся, што іменна дзесьці тут нейкім гарачым летам пракладваў свае першыя барозны будучы беларускі пісьменнік Іван Іванавіч Канановіч. Іх, курсантаў Баранавіцкага вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі, прыслалі сюды на вытворчую практыку, і яны, здаровыя і вясёлыя хлопцы, жылі ў бабкі на хутары, паспяваючы за дзень багата чаго зрабіць: поле ўзараць, вясковых дзяўчат паказытаць, гаспадыні дровы пакалоць, за што мелі ўранку па кубку пеністага сырадою, а то, пры патрэбе, і збанок моцнага бярозавага квасу. Хутчэй за ўсё ў бесклапотным юнацкім узросце гэты шчыры і працавіты сейбіт наўрад ці задумваўся над уласным жыццёвым лёсам, аднак тыя палеткі, якія ён засяваў шчодрай рукою, ускаласіліся буйна і прыгожа. Яно і нядзіўна: першыя барозны былі пракладзены па тлустых суглінках і чарназёмах, на хлебадайнай беларускай зямлі, аблашчанай грымотнымі майскімі навальніцамі і зацярушанай трапяткімі жнівеньскімі зарніцамі.

Адсюль, з ваколіц Падлесся, у бязлеснай, па сутнасці, зоне, з рэдкімі толькі астраўкамі негустога дрэвастою, калі тэпаць нацянькі палявымі дарогамі і прасёлкамі, за дзень няспешнай і лёгкай хадзьбы можна выбіцца на слаўную Капыльшчыну, дзе сярод квітучых садоў і зялёных ніў прытулілася невялічкая вёсачка Кукавічы. Тут у працавітай сялянскай сям'і нарадзіўся шаноўны сёння празаік, тут спазнаў і смак хлеба, і суровую бацькоўскую навуку. Калі пачалася вайна, дапытліваму хлапчуку было ўсяго тры гады, але ён добра запомніў голад і холад, людскія слёзы і кроў. Пазней ваеннае ліхалецце, трывожнае дзяцінства, на здзіўленне, стануць дамінуючымі ў творчасці Івана Канановіча, бо яго жыццёвыя шляхі-дарогі былі перапоўнены іншымі ўражаннямі і багатымі назіраннямі, з якіх склалася не адна праўдзівая і таленавітая кніга прозы. З пасведчаннем трактарыста-машыніста шырокага профілю, атрыманым у згаданым ужо вучылішчы, будучы пісьменнік працаваў у Цімкавіцкай МТС, пабываў на цаліне, зноў вучыўся ў Мінскім ГПТВ-9, дзе атрымаў спецыяльнасць слесара. Палявыя дарогі і прасёлкі, як бачна, нечакана павярнулі на гарадскія бульвары і праспекты, адразу змяніўшы і чалавечы лёс, і напрамак ягонай творчасці.

Першыя задаткі да прыгожага пісьменства Іван Канановіч яшчэ ў дзяцінстве атрымаў сярод навакольнага асяроддзя і працавітых, шчырых вяскоўцаў, ад якіх ніколі не зачынялася ні хата, ні кузня, ні гараж. Бацька празаіка, Іван Алексеевіч, быў знакамітым на ўсю ваколіцу яшчэ з 1930-х гадоў шафёрам, майстрам-кавалём, вырабамі якога і цяпер карыстаюцца і ганарацца. Вёска Кукавічы месціцца на сумежжы Нясвіжскага і Клецкага раёнаў, непадалёк і Стаўбцоўскі. І сюды, здалёк і зблізку, ехалі і прыходзілі пешшу людзі са сваімі клопатамі. Каму воз ці драбчак акаваць, плуг ці барану падладзіць, зрабіць серп або адштукаваць згублены ключ да замка. З ранку да вечара ў кузні было цесна ад гаманкога люду. Іх аповеды, жыццёвыя выпадкі і здарэнні глыбока западалі ў душу хлапчука ў тыя першыя пасляваенныя гады. Ён разам са старэйшым братам Сымонам з цямна да цямна рупіўся ў кузні, а ўбачанае і пачутае адкладвала ў душы глыбокае, непаўторнае ўражанне.

Доўгімі зімовымі вечарамі бацька расказваў дзецям пра выдатнага паэта-кукаўляніна Лявона Лобіка (1871—1918), аўтара зборнікаў «Залом у жыце», «Лекар-вядзьмар», «Калядны вечар» і іншых, чытаў яго вершы і аповеды, не прамінаў нагадаць і пра рэвалюцыйную дзейнасць земляка. Забягаючы наперад, хачу зазначыць, што прыкметна пазней слынны празаік напіша дакументальныя апавяданні пра юнацкую сустрэчу Лявона Лобіка і Якуба Коласа, бо вёска Мікалаеўшчына не так ужо і далёка ад капыльскіх Кукавіч. Гэты твор друкаваўся ў газеце «Літаратура і мастацтва» і, як помніцца, меў шырокі рэзананс у чытачоў.

Такія вось яскравыя штрыхі з дзяцінства. Але на многія гады родным домам для Івана Канановіча стаў Мінскі аўтамабільны завод — працаваў тут слесарам-рамонтнікам, інжынерам, а пасля заканчэння факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта ўдосталь пасмакаваў і газетнага хлеба ў якасці карэспандэнта, загадчыка аддзела, намесніка рэдактара газеты «Аўтазаводзец». Менавіта гэты круты паварот жыцця сфарміраваў вясковага юнака як празаіка так званай рабочай, «вытворчай» тэмы. Першае сваё апавяданне «Пераправа» малады аўтар яшчэ ў 1975 годзе надрукаваў у часопісе «Маладосць», куды, трэба сказаць, вельмі многія пачаткоўцы заляталі імклівымі, настырнымі стрыжамі, а вылятали непрыкметнымі шэрымі вераб'ямі. Тая першая публікацыя ў маладзёжным выданні Івану Канановічу, наадварот, дапамагла шырэй развінуць крылы, з дастатковай ужо вышыні лепей і ясней убачыць уласныя набыткі і пралікі, чаго ў сваёй творчасці не абмінуў, бадай, ніводны сур'ёзны пісьменнік. «Пераправа» з вытворчых цэхаў аўтамабільнага гіганта да зычлівай чытацкай аўдыторыі сапраўды была ўдалай, бо зусім праз невялікі адрэзак часу мы займелі мачымасць з асалодай чытаць змястоўную і цікавую кнігу творцы «Заводскія світанні». Насуперак усё таму непрадказальнаму лёсу чамусьці не вясковыя, пяшчотна-кукувіцкія, а менавіта грымлівыя заводскія світанкі неабвержна засведчылі: у літаратуру прыйшоў чалавек з багатым вопытам, сталымі думкамі, глыбокай эрудыцыяй і адметным поглядам на жыццё, суровую рэчаіснасць.

Кніга адна з нямногіх на той час пра чалавека рабочай загартоўкі была з увагай і прыхільнасцю сустрэта нашай крытыкай. І не сама важнасць тэмы сталася таму прычынай: малады пісьменнік у жыцці звычайнага заводскага калектыву ўбачыў тое, чаго не заўважалі іншыя. Бадай праз усе яго творы праходзіць дужа прывабная думка: чалавек слаўны працай. Такі вось, працавіты і непаседлівы, ветэран завода Зрайкоўскі, герой лепшага ў кнізе апавядання «Стары зваршчык». Ён яшчэ не ведае, у якую глыбокую прорву апусціцца неўзабаве родны завод і, выхаваны на бацькоўскай павазе да людзей, іх занятку, літаральна дрыжыць, перажывае за кожную дробязь. З другога апавядання — «Дзень пасля адпачынку» — сваімі неардынарнымі характарамі запамінаюцца слесар Дземідовіч, пранырлівы Чыжык, гультаяваты Карповіч, халтуршчык Круталевіч. У яшчэ адным цікавым апавяданні «На скрыжаванні дарог» аўтар зрабіў відавочную спробу стварыць займальны, арыгінальны сюжэт і выйшаў за цесныя рамкі ўласнага жыццёвага вопыту і светапогляду. Ну, і, само сабой, значнай творчай удачай празаіка можна лічыць аповесць «Заводскія світанкі», у якой выйгрышны «вытворчы» матэрыял узноўлены ў ёмкім мастацкім слове, а галоўны герой твора Кратовіч прываблівае чытача не толькі працоўнымі поспехамі, але і цікавасцю да жыцця, да вартых усмешкі розных любоўных прыгод.

Першая празаічная ластаўка, што, вобразна кажучы, прамільгнула ў яркіх водблісках заводскіх світанкаў, расчысціла цярністы шлях новым кнігам Івана Канановіча. Гэта яго зборнікі прозы «Белы чыгун», «Цёплы камень», «Асобая зона», «Чорныя цені», аповесці «Майдан», «Абвінавачанне ў забойстве», «Старыя званы», дзясяткі апавяданняў, якія друкаваліся ў беларускіх часопісах і газетах. Усе яны сведчаць аб уменні пісьменніка дынамічна спалучаць рэаліі вытворчага побыту, стыхію сямейных драм і проста чалавечых характараў. Калі ў першых творах ён дэталёва з веданнем справы распрацоўваў заблытаныя праблемы рабочага калектыву ва ўмовах адміністрацыйна-каманднай сістэмы, то цяпер піша пераважна пра нашых сучаснікаў, пагарэльцаў Чарнобыля, духоўнае апусташэнне беларусаў. Сістэма, якая бязлітасна трушчыла лёсы людзей, асабліва пераканаўча паказана пісьменнікам у аповесці «Асобая зона», дзе праз рабочую дынастыю Арціменяў глыбока даследуецца ўвесь трагізм так званага застойнага часу. Але і цяпер не стала лепш: цэлыя пакаленні амаль цалкам ужо спляжыў рэзкі, неабдумны паварот да «дзікага» капіталізму, а таксама Чарнобыль — рэальны і духоўны.

А повесць-быль з нязвыклай назвай «Майдан» — гэта сапраўдны плач па забруджаных радыяцыяй, пакінутых вёсках, дзе праз ачалавечаны вобраз Чарапахі пісьменнік наблізіў нашчадкаў да разумення самай вялікай трагедыі дваццатага стагоддзя, гэтага змрочнага прароцтва Апакаліпсіса, якое, на жаль, збылося на і без таго спакутаванай беларускай зямлі. З «Майданам» у нечым пераклікаецца яшчэ адзін твор празаіка — «Старыя званы», дзе праз трагічны вобраз хворага на экзэму Васіля Кавалевіча ўзнята і глыбока даследуецца тэма духоўнага Чарнобыля. Зноў жа менавіта апошнія дзве аповесці яшчэ раз засведчылі: да свайго юбілею празаік прыйшоў з багатым творчым набыткам, высокім прафесійным уменнем. З-пад пяра самабытнага майстра слова даўно ўжо выходзяць сталыя і дасканалыя мастацкія рэчы, і гэта дало падставу паэту Кастусю Жуку слушна і справядліва зазначыць: «У шумлівым шматгалоссі нашых беларускіх літаратараў неяк нязмушана і ўпэўнена-пераканаўча гучыць голас неўтаймаванага на пошук, няўрымслівага ў сваёй справе Івана Іванавіча Канановіча. Ён стаў легендай пры жыцці не толькі дзякуючы сваім творчым "адысеям", а, перш за ўсё, высокачалавечым, узвышана-духоўным адносінам да людзей. Кніг маладых аўтараў, якія ён пабацькоўску шчыра і тонка адрэагаваў за сваю бытнасць у "Мастацкай літаратуры", — з лішкам хапіла б, каб заставіць паліцы не адной хатняй бібліятэкі. І гэта пры тым, што паважлівае стаўленне да маладых вымушае неверагодна павышаных намаганняў, сіл, энергіі, часу. Бо, няма тут сакрэту, маладому заўсёды хочацца дапамагчы, паставіць "на ногі", каб хутчэй адчуў пад сабою трывалую глебу, а ў душы — сваю творчую аўру». Гэтай справе паважаны празаік і рэдактар прысвяціў дастаткова значны кавалак свайго лёсу, імпульсіўнага чуцця, трывог і клопатаў за падрастаючае літаратурнае пакаленне.

Пісьменнік Іван Канановіч — з тых людзей, якім, нягледзячы на шаноўны ўзрост, не сядзіцца дома. Нават зімой, у немалыя маразы, яго ў выхадныя не застанеш, ён уцякае з гарадской кватэры, а летам, як толькі прагрымяць першыя майскія навальніцы, ягоныя шляхі-дарогі нязменна вядуць на родную Капыльшчыну — блаславёную зямлю, якая дала беларускай літаратуры нямала славутых пісьменнікаў. Там, у сваіх Кукавічах, з часін горкага ваеннага дзяцінства жывуць героі яго таленавітых кніг, хаця, трэба сказаць, уласная кніжная паліца не дужа вялікая. Але і тое, што паспеў напісаць наш вядомы празаік, варта ўвагі і захаплення, шчырых чытацкіх сімпатый. З пульхнага і глыбокага ворыва, калісьці ўзаранага на векавечных бацькоўскіх аблогах, даспела важкае, тугое, поўнае калоссе.

Віктар ГАРДЗЕЙ

Паміж біяграфіяй і мастацтвам

Пісьменнікі — людзі незвычайныя. Гэта ўсім вядома. Нездарма пра іх увесьчасна кажуць: не ад гэтага свету, галава ў мроях… Творчы чалавек сваім талентам асуджаны заўсёды, кожную хвіліну жыць на два сюжэты: рэальная біяграфія, якая адлюстроўваецца ў фактах, і паэтычная сапраўднасць, якая знаходзіць выяўленне ў творах. Другі сюжэт для самога пісьменніка не менш рэальны за першы. І калі за развіццём біяграфіі часта прыглядваюць блізкія людзі і анёлы, то ў мастацкай творчасці — неаспрэчны і ўсёўладны гаспадар адзін. Творца.

ВЕЧНА МАЛАДЫ, ЗАЎСЁДЫ АКТУАЛЬНЫ

Кожны тоўсты літаратурна-мастацкі часопіс — гэта цэлая эпоха ў гісторыі нацыянальнага прыгожага пісьменства. Нават калі гісторыя яго выдання не сягнула далей за некалькі гадоў. Часопіс ствараецца як пэўная канцэпцыя развіцця літаратуры (а шырэй — гуманітарнай сферы ўвогуле), «бярэ на выхаванне» пэўнае пакаленне, загартоўвае таленты, фарміруе мастацкія плыні і напрамкі. Усё гэта ў поўнай меры стасуецца да часопіса «Маладосць», які сёлета святкуе 65-годдзе.

Юбілейны красавіцкі нумар атрымаўся надзвычай змястоўны, насычаны, разнапланавы і разнажанравы. Да яго, думаецца, будуць звяртацца не адно дзесяцігоддзе: такі сабе кароткі курс гісторыі выдання ад 1960-х да нашых дзён. Аўтары розных пакаленняў прадставілі сваё бачанне кожнага перыяду жыцця часопіса, якое красамоўна акрэсліваецца ў назвах раздзелаў: «1950-я. Гартаючы рарытэты», «1960-я. Вецер перамен», «1970-я. Паралелі і перпендыкуляры», «1980-я. Паміж вусцішшу і шчасцем», «1990-я. Час надзеі», «2000-я. На пачатку новага стагоддзя». І апошні раздзел — «*2010-я. Random forest*» — толькі пачаты, бо пішацца ў сучаснасці і асэнсоўваць яго будуць літаратурныя пераемнікі.



Першыя сціплыя публікацыі класікаў і смелыя прапановы, якія засталіся на ўзроўні дэкларацый, унікальныя аўтарскія праекты, знакавыя інтэрв'ю, шаржы, пародыі, кур'ёзныя выпадкі і складаныя падцэнзурныя часы, характэрныя фота- і графічныя мастацкія ілюстрацыі… І, зразумела, постаці, рэдактарскія прынцыпы якіх сталі падмуркам сучаснага аблічча «Маладосці»: Аляксей Кулакоўскі, Пімен Панчанка, Алесь Асіпенка, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Анатоль Грачанікаў, Генрых Далідовіч, Раіса Баравікова. І — Тацця Сівец і Святлана Воцінава, якія перанялі эстафету ў новым стагоддзі. Даследуючы і супастаўляючы гістарычную эпоху і эпоху літаратурную, маладосцеўцы змаглі адшукаць адметны аўтарскі падыход да ўсіх галоўных рэдактараў. І гэта, безумоўна, дапамагло аднавіць гісторыю развіцця часопіса ў творах, канцэпцыях і асобах.

У РУКАХ СУЧАСНАСЦІ

Пра Чарнобыль пісаць няпроста. І калі пісаць, то — відавочнае, публіцыстычнае. Асэнсоўваць тэму ў межах мастацкай прозы, не паўтараючы сказанага, не рызыкуючы надаць словам банальнага пафасу, — амаль немагчыма. Увесь час думаеш пра гэта, чытаючы апавяданне **Наталлі Касцючэнкі** «Бабіна лета». Галоўная гераіня вяртае нас у верасень 1985 года — для многіх апошняе шчаслівае, не бесклапотнае, але насычанае звыклым сялянскім клопатам. Сцішаная самота настальгічных успамінаў — пра незабыўнае і незваротнае, глыбокі чалавечы роздум і такі пазнавальны беларускі гумар! Не роспач з рытуальным плачам, а канцэнтрацыя болю. І чым больш запаволеная апавядальная рытміка, тым больш выразна гэта адчуваецца.

Казімір Камейша зноў прапаноўвае нам спыніць імгненне «паміж кубкам і вуснамі» і задумацца над хуткаплыннасцю жыцця, двухсэнсоўнасцю чалавечых абяцанняў, прывідным шчасцем здзейсненых мараў… І — сапраўднай сутнасцю паэзіі, лабірынтамі якой ходзяць многія, але знаходзяць выйсце адзінкі.

І гэта выдатна ілюструюць вершаваныя нізкі **Мар'яна Дуксы**, **Пятра Жаўняровіча** і **Юрыя Баены**. Паэтычная думка, натхнёная тэмай Вялікадня, узнеслася ў вышыні духоўнага самапазнання. Мар'ян Дукса заглыбляецца ў рэлігійныя рэфлексіі, шукае ў біблейскіх запаветах надзейныя адказы на спрадвечныя пытанні. Пятро Жаўняровіч наладжвае сваю ліру на тонкі паэтычны лад у пошуках суладдзя мелодый сонечных промняў і людскіх мараў. А вось герой Юрыя Баены значна больш зямны ў сваіх памкненнях: не баіцца ісці неспазнанымі дарогамі лёсу, зрэшты, і бездараж няпэўнасці ў дні заўтрашнім яго таксама не пужае.

«Галасы свету» гэтым разам прамаўляюць з Украіны. У навелах украінскай пісьменніцы **Марыі Вайно** беларускі чытач сустрэне добра знаёмыя інтанацыі: пошукі шчасця на схіле самотных дзён, звычайны штодзённы клопат і вера ў неўміручасць кахання.

СПАКУСА НЕЗВЫЧАЙНАСЦІ

Крыху ўводзіць у зман назва аповесці **Мікалая Краўцова** «Пяць рублёў вырашаюць усё». Не разгледзіш за гэтымі практычна-эканамічнымі словамі фантастычнамістычнага зместу. Галоўны герой твора Міхаіл пасля смерці бацькі пачаў забаўляцца перасяленнем у целы іншых людзей: пасля таго, як адпомсціў усім нядобразычліўцам-калегам, ездзіў па замежжы ў целах выпадковых турыстаў, наведваў дарагія рэстараны, сустракаўся з прыгожымі жанчынамі. Аднойчы нават прабыў некалькі гадзін у целе кацяня…

Вясёлае чытанне перарываецца філасофскай высновай: як бы ні было шыкоўна мець магчымасць пражыць некалькі жыццяў, тваё адзінае, недасканалае, самотнае, жыццё — найлепшае. Герой «затрымліваецца» на працяглы час у целе суседа-алкаголіка Стасіка (якога судзяць за крадзеж і напад), пакуль яго ўласнае цела знаходзіцца ў неўралагічным аддзяленні ў стане комы. Жаданне вярнуцца да сябе сапраўднага ўяўляецца найвялікшым шчасцем, рызыкаваць якім ужо больш ніколі-ніколі Міхаіл не збіраецца. Ну, хіба толькі дзеля таго, каб перасяліцца ў цела Барака Абамы і навесці парадак у міжнароднай палітыцы. Павучальныя высновы аказваюцца падманкай: не, тут няма класічнай маралі, бо чалавек не можа супрацьстаяць спакусе не быць звычайным.

Іван Саверчанка прапаноўвае аўтарскі пераклад на рускую мову аповеду «Скарбы крывічоў. Па слядах легенды». Перад намі паўстае гісторыя Рагвалода — ад пачатку яго княжання на Полацкай зямлі да самай смерці. Гісторыя, важная і родная нам настолькі, што яе можна пераасэнсоўваць у любым жанры і родзе мастацтва. Створаны з відавочным азнаямляльна-адукацыйным ухілам (згадваюцца не толькі гістарычныя даты, але і персанажы беларускай міфалогіі, старажытныя абрады), аповед будзе асабліва цікавы школьнікам і настаўнікам, а таксама тым, хто хоча за кароткі час пазнаёміцца з беларускай даўніной.

Віктар Шніп у паэтычнай нізцы з аднайменнай назвай пераконвае, што «яшчэ няпозна штосьці памяняць». Тужлівым дысанансам гучаць у гэтыя сонечныя дні пранізлівадажджлівыя лістападаўскія матывы. Зрэшты, самаадчуванне паэта супадае з унутраным настроем, а не з тым, што на дварэ. І калі адзінота назапасіла пад небам жыцця слёз, што хопіць для цэлай планеты, няма прычын іх стрымліваць. Мары пра каханне, уплеценыя ў восеньскія краявіды, гучаць натхнёна і самотна дзякуючы ўдаламу перакладу на рускую мову Юрыя Мацюшкі.

Восеньскую песню пераймае і гераіня **Тамары Красновай-Гусачэнкі**. Нізка «Беражы тое, што ёсць» насычаная болем страты, «ад якога няма ратунку», але адначасова і — любоўю, якая мае шмат абліччаў, формаў, слоў, але не мае ўзросту. Пустэчы дробязнага клопату і мізэрных думак паэтэса супрацьпастаўляе менавіта любоў. І калі чалавек не будзе «тратить сил души на пустоту», то гэтая ісціна яму адкрыецца.

Вершы **Івана Валасюка**, **Кацярыны Дзерышавай**, **Ірыны Жарыкавай**, прадстаўленыя ў раздзеле «"Сябрына": Беларусь — Украіна», вызначаюцца надзвычай напружаным адчуваннем сучаснасці — на мяжы жыцця і смерці, надзеі і безвыходнасці, паміж забыццём і вечнасцю. Нельга абвінаваціць паэтаў у празмерным пафасе, бо ў вершах няма ніводнага выпадковага, штучнага радка.

Жана КАПУСТА

БЕЛЫ ВОІН СВЯТЛА

Адзін з лепшых твораў падборкі Пятра Жаўняровіча з «касмічнай» назвай «Да высяў міжзорных!..» — «Балада промня святла». З першых радкоў твор настолькі зачароўвае яркай вобразнасцю, шырокай абазнанасцю аўтара ў мінералогіі і раслінах, багатай мовай, што не адразу становіцца відавочным другі план: драматычны сэнс і змест балады. Ён паволі выступае з-пад вонкавай прыгажосці. Але словы, якія быццам нагадаў промню Хрыстос, чуе і чытач: «…ці ў тым жа галоўная мэта — раздаваць хараство толькі знешнім праявам…». Паўторны пералік дарункаў, якімі промні надзялілі душу, у канцы твора нібы вяртае чытача да пачатку верша, утвараючы кальцавую кампазіцыю. Радкі гучаць урачыста і ў той жа час драматычна:

І сыпнулі ў душу дыяменты, агаты, рубіны,
І смарагды, бурштын, і апошні свой аквамарын.

Асабліва пра аквамарын — таму што ён апошні. У творы ўсё іншасказальна, але галоўная думка зразумелая: сэнс існавання — у самаахвярным служэнні іншым, у тым, каб жыццём сваім павялічыць колькасць дабра ў свеце. Прамень — як белы воін святла (адзін з сабе падобных у нябесным воінстве). А душа, альбо душы, — тыя, хто прымае светлыя дары, тыя, дзеля каго існуюць промні.

Паўтор як паэтычны прыём ужыты аўтарам і ў іншым творы пад назвай «Запозна»:

…Светлы дзень вясновы,
Толькі ўсё нанова
Нельга нам пачаць пасля зімы.

Гэтымі радкамі адкрываецца верш, яны ж гучаць і завяршальным акордам. У расповедзе пра незваротнасць мінулага (дакладней, адносін, што засталіся ў мінулым) аўтар быццам знарок пазбягае слоў з адценнем пакуты: *адзінота*, *самота*, *боль*, *страта* і г. д. (праўда, аднаго разу ўсё ж «безнадзейная скруха» мільгае ў тэксце). Разам з тым спакойны, роўны, апавядальны тон красамоўна сведчыць аб унутранай сіле лірычнага героя, здатнага спраўляцца са сваімі перажываннямі: яны праблісква­юць, але не перамагаюць. Адчуванне драматызму ўзмацняецца праз фінальны паўтор. Уменне мінімальнымі сродкамі выказаць няпросты душэўны стан ёсць прыкметай сталасці і майстэрства (часта ў вершах падлеткаў можна назіраць карціну «істэрыкі» са спробамі парэзаць вены і канвульсіўнымі сутаргамі плачу, але там лірычнаму герою лягчэй «ачуняць» — як дзіцяці, якое, выплакаўшы сваю крыўду, супакоілася ды забылася пра яе).

Трохі іншым настроем адзначаны верш «Белы заяц пад белымі крыламі». Гэты напаўжартоўны твор наўпрост адсылае да вядомых вершаў Уладзіміра Караткевіча «Заяц варыць піва» і Віктара Шніпа «Белы і белае». Усе вобразы — з У. Караткевіча: і зямля пад белымі крыламі, і Бог, які жыве на Беларусі, і янтарнае піва — з эсэ «Казкі Янтарнай краіны», і белае полымя — з аднайменнага апавядання, прысвечанага дзядзьку Міколу Садавому, які працаваў на Чукотцы. Зразумела, што адсутнасць знакаў прыпынку (іншым творам Пятра Жаўняровіча не ўласцівая) — спроба ўвайсці ў стылістычнае «поле» твора Віктара Шніпа, таксама як і згадкі Ларысы Геніюш, белай гарачкі і белай паганкі, ды й кантраснасць верша — асноўныя колеры ў якім, як і ў В. Шніпа, — чорны і белы. Але ў адрозненне ад В. Шніпа, П. Жаўняровіч усё ж частуе зайца півам «з дадаткам белай паганкі». Паколькі дзея адбываецца «ў чорных абрысах белага аркуша», трэба меркаваць, што зайцу не пагражае атручэнне. Бо ў рэальнасці белая паганка — адзін з самых небяспечных грыбоў нашага лесу. Пры такім багацці выразных сродкаў нудна быць увесь час лірыкам — бывае, што хочацца і пажартаваць…

Яна БУДОВІЧ

ХІТРАСПЛЯЦЕННІ ЛЕТАПІСАЎ

Вячаслаў Чамярыцкі — адзін з самых вядомых беларускіх літаратуразнаўцаў-медыявістаў, скарыназнаўца, спецыяліст па айчынным летапісанні. У мінулым годзе ў выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла з друку яго кніга «Жыватворная спадчына» — важкае падсумаванне пяцідзесяці гадоў працы на ніве беларускай акадэмічнай навукі.

Як адзначаў гісторык і літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук Генадзь Кісялёў, Вячаслаў Чамярыцкі выдатна разбіраецца ў «хітраспляценнях розных спісаў і рэдакцый летапісных помнікаў, у розначасовых вольных і нявольных напластаваннях. Як высакакласны спецыяліст В. Чамярыцкі быў запрошаны да ўдзелу ў падрыхтоўцы да выдання беларускіх тамоў (32 і 35) акадэмічнага "Поўнага збору рускіх летапісаў" (выдавецкая серыя пад такой традыцыйнай назвай выходзіць у Расіі ажно з 1841 года)». Дзякуючы работам Вячаслава Чамярыцкага можна даведацца пра гісторыю стварэння «Летапісу вялікіх князёў літоўскіх», магчымага заказчыка «Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага», адметнасці рукапісу Магілёўскай хронікі…

Людзі, якія прафесійна цікавяцца літаратурнымі помнікамі XII—XVIII стст., безумоўна, ужо маюць кнігу «Жыватворная спадчына» на сваёй паліцы. Але гэта выданне можа быць карыснае і для чытачоў, якія цікавяцца іншымі гістарычнымі перыядамі. І вось па якіх прычынах.

Па-першае, у кнізе абмалёўваецца літаратурнае жыццё не толькі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, але і Беларусі 1960—1990-х гадоў. Таму «Жыватворная спадчына» будзе выдатнай крыніцай для даследчыка, які возьмецца пісаць пра асаблівасці культурнай сітуацыі і перыпетыі вывучэння даўняй літаратуры ў савецкую эпоху. У дадатку змешчана невялікая аўтабіяграфія і два інтэрв'ю з Вячаславам Чамярыцкім — адно за аўтарствам Сяргея Кавалёва, другое — Анатоля Клышкі. У гэтых тэкстах нярэдка згадваюцца праблемы ідэалагічнага характару, з якімі сутыкаліся літаратуразнаўцы, а ўспаміны пра юнацкія гады дазваляюць уявіць, якімі шляхамі прыходзілі да акадэмічнай навукі вясковыя хлапчукі. Варта адзначыць і ўспаміны пра старэйшага калегу і сябра Генадзя Кісялёва, дзе створаны партрэт сапраўднага навукоўца — чалавека, адданага сваёй справе, які заўсёды памятае пра краіну, дзеля якой працуе. Супрацоўнікамі Вячаслава Чамярыцкага былі таксама Юльян Пшыркоў, Аляксандр Коршунаў, Мікалай Улашчык, пра якіх даследчык піша з вялікай цеплынёй.

Па-другое, кніга выбранага Вячаслава Чамярыцкага — нагода ўспомніць не толькі літаратуру XII—XVIII стст., але і даследаванні, мастацкія творы, якія пабачылі свет у XX стагоддзі. Шаноўны даследчык пісаў пра пераклад «Слова пра паход Ігаравы», зроблены Янкам Купалам, рэцэнзаваў раман Алега Лойкі «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае», з глыбокай павагай адгукаўся пра даследаванні Аляксея Мельнікава, прысвечаныя Ефрасінні Полацкай і Кірылу Тураўскаму. У раздзеле «Чытаючы кнігі калег» змешчаны рэцэнзіі Вячаслава Чамярыцкага на навуковыя выданні, этапныя для свайго часу.

Трэці істотны момант: у многіх навуковых артыкулах Вячаслаў Антонавіч піша не толькі пра акалічнасці, важныя для вузкіх спецыялістаў, але і пра рэчы, якія варта ведаць кожнаму беларусісту. Так, у артыкуле «Паданні пра Рагнеду і праблема Полацкага летапісу» даследчык звяртаецца да праблемы датавання трагічных падзей, звязаных са сватаннем Уладзіміра

да Рагнеды. Вячаслаў Чамярыцкі адзначае храналагічную неадпаведнасць даты сватання Уладзіміра да Рагнеды і гадоў жыцця князя Яраслава, які, на думку большасці гісторыкаў, быў іх агульным сынам. Думкі спецыялістаў на гэты конт адрозніваюцца: адны лічаць, што ў летапісах няправільна абазначаны ўзрост князя Яраслава, другія мяркуюць, што Яраслаў не быў сынам Рагнеды, трэція прапануюць лічыць годам сватання Уладзіміра да Рагнеды не «летапісны» 980 г., а 978 г. Менавіта трэці падыход да вырашэння праблемы абгрунтоўваецца ў артыкуле Вячаслава Чамярыцкага.

Даследчык шукае адказы на многія іншыя сутнасныя пытанні. Кім лічыў сябе Францыск Скарына — ліцвінам ці русінам? Ці існаваў Наваградскі летапіс? Як склаўся лёс нашчадкаў Усяслава Чарадзея? Чытач падрыхтаваны, гатовы да сур'ёзнай размовы, знойдзе ў кнізе «Жыватворная спадчына» шмат новых фактаў і цікавых ідэй.

Для аўтара, безумоўна, было радасна выдаць сваю кнігу ў год, юбілейны для беларускага кнігадрукавання. Шэраг артыкулаў, прадстаўленых у выданні, прысвечаны жыццю і дзейнасці нашага славутага першадрукара. Яшчэ адна тэма, важная для Вячаслава Антонавіча, — гісторыя Навагрудчыны, малой радзімы навукоўца.

Выданне змяшчае спіс публікацый Вячаслава Чамярыцкага за 1958—2016 гг., пералік кніг, выдадзеных пад яго рэдакцыяй. Як сведчаць каментарыі, многія тэксты друкуюцца ўпершыню паводле рукапісаў.

У кнізе багата прывабных загалоўкаў: «Загадкі адной беларускай калядкі XVIII ст.», «Беларус і яго імя», «Ці існавалі Дудуткі ў XII ст.?». Чытач, які звернецца да гэтых публікацый, не пашкадуе пра свой выбар і, цалкам верагодна, пачне з большай цікавасцю ставіцца да літаратурных помнікаў мінулых гадоў.

Як казаў Іаган Гётэ, «лепшае, што дае нам гісторыя, — гэта энтузіязм, які яна абуджае». «Жыватворная спадчына» — кніга, напісаная рукой захопленага навукоўца, чалавека, які любіць сваю Радзіму. Менавіта гэта высокая любоў натхняе Вячаслава Чамярыцкага на навуковыя росшукі, асвятляе старонкі даследаванняў замежных гісторыкаў і філолагаў. Вячаслаў Антонавіч часта згадвае пра значнасць працы беларускіх вучоных гуманітарыяў: «Па тым, як мы ставімся да сваёй культурна-гістарычнай спадчыны, у свеце мяркуюць, што мы за народ». Таму кніга Вячаслава Чамярыцкага надае імпэту і ўпэўненасці не толькі даследчыкам, але і ўсім, хто цікавіцца мінулым нашай краіны.

Юлія ШПАКОВА

Адолець строму

Навум Гальпяровіч не проста вандруе па скрыжаваннях памяці. На любым шляху, у любой частцы свету і ў любым кутку роднай краіны ён знаходзіць адметных, таленавітых людзей і дзеліцца з намі часцінкай іх творчасці. Асаблівай цеплынёй атуленыя сяброўскія згадкі пра Алеся Пісьмянкова «Дарога на строму».

«Дарога на строму / Нялёгкая дужа. / Як раннюю стому / Адолець мне, дружа?» — гучаць тужлівым рэхам радкі Алеся Пісьмянкова, якія і далі назву споведзі сябра. Дзе-нідзе з гумарам, а часцей — са сцішанай самотай апісвае пісьменнік незабыўныя сустрэчы, размовы, шпацыры і прыгоды. Пры першай сустрэчы на семінары маладых літаратараў у Каралішчавічах палачаніну Навуму Гальпяровічу модна апрануты мінчук Алесь Пісьмянкоў не спадабаўся — «сваёй кінематаграфічнай прыгажосцю, густым барытонам, упэўненасцю і колам прыхільнікаў». А праз многія гады менавіта дзякуючы сяброўству з гэтым чалавекам Н. Гальпяровіч адчуў, што ўжо не толькі Полацк, але і Мінск для яго таксама — родны горад. Вершы А. Пісьмянкова (наўрад ці можна будзе прачытаць іх у томіку выбраных твораў), вясёлыя гісторыі, што стваралісь неверагодна дасціпным адчуваннем гумару паэта, і, вядома ж, шчымлівыя згадкі апошняй сустрэчы… Мы ўбачым іншую сталіцу, якой не можам памятаць, іншы ўзровень пісьменніцкіх стасункаў, іншыя вершы, якіх больш не пішуць.

Жана КАПУСТА

У новай кнізе Навума Гальпяровіча з вобразна-метафарычнай назвай «На скрыжаванні сноў» («Мастацкая літаратура», 2018) сабраныя абразкі-ўспаміны маленства, юнацтва, сталення аўтара — тыя сонечна-шчаслівыя імгненні, якія з вышыні гадоў здаюцца ці то снамі, ці то яваю. Аўтар папярэджвае: гэта не дакументальныя аповеды, хоць многія могуць пазнаць у дзеючых асобах сябе. Чалавечая памяць мае ўласцівасць нешта прыхарошваць або, наадварот, ачарняць, пакідаць толькі самыя яркія фрагменты, а калі яшчэ надаць ёй высокай паэзіі і настальгічнага суму, то атрымаецца хутчэй не дакладны фотаздымак, а малюнак, эцюд, падрыхтоўка да маштабнага палатна.

Абразкі сапраўды ўспрымаюцца менавіта так — як непрычасаныя, па-дзённікаваму шчырыя старонкі пражытага і перажытага. Занатаваныя ў іх жыццёвыя эпізоды, на першы погляд, вельмі асабістыя, будзённазвычайныя. Але чаму яны так хвалююць? Чаму прымушаюць сцішыцца, задумацца? Што за магія такая ў гэтых простых, немудрагелістых радках?

Сакрэт, на мой погляд, у незвычайнай адкрытасці аўтара, яго кранальнай спавядальнасці. А яшчэ, магчыма, у тым, што ён, разгортваючы стужку памяці, выхоплівае ў ёй самае ўражлівае, самае цікавае, адкідваючы ўсё выпадковае, неістотнае.

«Калі я згадваю мінулае, — прызнаецца Н. Гальпяровіч, — больш помніцца пра светлае і высакароднае, пра добрыя і шчырыя ўчынкі людзей. І хай спагады і дабрыні атрымліваў больш ад тых, ад каго не чакаў, хіба гэта не здорава? Значыць, колькі яшчэ мы не ведаем тых слаўных, шчырых і спагадлівых людзей, якія ёсць сярод нас!»

Аповеды пра такіх асоб і складаюць аснову кнігі. Найбольш пранікнёныя, шчымліва-хвалюючыя радкі прысвечаны самым блізкім і родным для аўтара — яго бацькам.

«Божа, як мне не стае маёй матулі! Як мне самотна і адзінока без яе вачэй і ўсмешкі, без яе даверлівых доўгіх размоў, без яе ўніклівага і ўсёразумеючага пагляду… Як шмат я не сказаў ёй, і толькі цяпер, калі выраслі ўласныя дзеці, я з унутранымі слязамі зразумеў, як адзінока становіцца тым, хто выгадаваў, выпеставаў і выпусціў у дарослае жыццё сваіх гадаванцаў».

Іншымі фарбамі малюецца партрэт бацькі: «Бацька мой быў інвалідам. Правую руку меў моцную, дужую, з бугрыстымі мышцамі, а левая — маленькая, скурчаная — вісела нерухома…

Ён часам любіў выпіць і быў тады гарачы і задзірлівы. Аднак мяне вельмі любіў…»

Як гэта важна, каб тваё дзяцінства было атуленае клапатлівай бацькоўскай любоўю. Гэтае цёплае, святое, ні з чым не параўнальнае пачуццё застаецца пасля на ўсё жыццё і праз гады сагравае душу, дае маральную падтрымку ў няпростых сітуацыях.

Увогуле, пісьменніку ўдаюцца партрэты сваіх герояў. Для іх абмалёўкі ён шукае свежыя фарбы, цікавыя параўнанні, небанальныя словы. Вось як, напрыклад, падаецца партрэт літоўскай дзяўчыны Ванды: «Яна была высокая, прыгожая, з белымі доўгімі валасамі і сінім бляскам вачэй, які, калі яна з'яўлялася на кухні або ў калідоры, нібы выцясняў усё астатняе святло. Загарэлыя ногі з белым пушком, маленькія туфлі на абцасіках, кароткая сукенка — увесь яе воблік быў нейкі нетутэйшы, нібы сатканы з гэтага сасновага водару, гэтых нёманскіх хваляў, з зыркага сонца…»

Н. Гальпяровіч — майстар мастацкай дэталі. Дэталі, якая часам можа замяніць цэлыя старонкі доўгіх, падрабязных апісанняў. Вось як у гэтым выпадку: «Пакой, куды нас пасялілі, быў вузкі і цесны, з вялікім чорнага дрэва, куфрам, з высокім буфетам, на якім стаяла бронзавая фігурка распятага Хрыста».

Вартасць кнігі, аднак, не толькі ў тым, што аўтар знаёміць нас з цэлым шэрагам цікавых, неардынарных людзей, — ён яскрава перадае атмасферу, каларыт, водар таго часу, у якім жывуць і дзейнічаюць героі. Чытач не проста ўбачыць Наваполацк часоў перабудовы, але і трапіць, напрыклад, разам з аўтарам на экалагічны мітынг у цэнтры горада — на плошчы Будаўнікоў, дзе сабраліся тысячы людзей.

Словам, зборнік прозы паэта Навума Гальпяровіча атрымаўся па-сапраўднаму змястоўны, па-філасофску роздумны, летуценна-паэтычны. А нацыянальная літаратура ўзбагацілася на яшчэ адну добрую, грунтоўную кнігу.

Зіновій ПРЫГОДЗІЧ

АДКРЫТЫМ БЫЦЬ, ЯК РАНА...

Міхась БАШЛАКОЎ

***

Ціха ісці дарогай,
Лугам ці полем жытнім,
Думаць пра лёс і Бога,
Згадваць радкі Уітмена.

Помніць пра лісце, травы,
Што ёсць жыцця аснова.
Цешыць душу не славай,
Звонкім і верным словам.

Кветкамі любавацца,
Што ля мяжы шырокай,
Ветрыку ўсміхацца,
Вольнаму, як аблокі.

Крочыць і быць шчаслівым:
З мройнага паднябесся
Па-над жытнёвай нівай
Птушкі губляюць песні.

Крочыць і — усміхацца
Далечы сіня-сіняй,
Думкамі наталяцца,
Думкамі аб Айчыне…

Паэт

Жыве дзеля радка —
Не трэба больш нічога…
Пад грукат цягніка
Звіваецца дарога…

Зноў едзе… Хоць куды —
Абы радкі ліліся…
Блукае ля вады.
Сінеюць звонка высі

І ў люстраной вадзе
Гукаюцца блакітам…
А слова ўсё не йдзе,
Пяшчотна-аксамітнае…

Шукае ўсё, дзівак,
Радок той, запаветны…
І кожны дзень вось так…
Вось так жывуць паэты…

Вы ж думаеце: мёд
Ён лыжкамі сярбае…
Працуе круглы год —
На хлеб жа ледзь хапае…

Ён песняю жыве…
Астатняе — няважна…
Ён воблакам плыве
Над вамі… недасяжна…

***

Вагон гудзеў. Людзей было нямала.
І кожны вёз з сабою мех турбот…
Мужык чытаў паэзію Купалы —
Пра мову, пра паноў і пра народ…

Дням сённяшнім радкі былі сугучныя:
Хапае зноў паноў і ліхвяроў…
Народ жа наш бяспамяцтвам атручаны —
Бязмоўны і бязлікі з тых часоў…

Я слухаў, і душа мая балела:
Як і тады, мы гэткія ж цяпер…
Паэта слова плакала, звінела
І скавытала, як загнаны звер…

Мужык чытаў сурова і натхнёна,
Нібы на людзях думкі вываяраў…
І чуліся Купалавы праклёны
Усім панам і ўсім зямным царам…

Радок шчымеў, душу маю трывожыў…
Хтось хмыкаў і хіхікаў…
Хтось сапеў…
Вагон маўчаў зацята і варожа,
Вагон Купалу ўжо не разумеў…

***

Калі са словам ты хітруеш,
З выгодай ладзіш свой санет,
Калі сумленнем ты гандлюеш,
Ты ёсць гандляр, а не паэт…

Калі ты спіну прагінаеш
Прад бляскам зорных эпалет,
Ад страху ледзь не паміраеш,
Ты — палахлівец, не паэт…

Калі начальству пільна служыш
І ліжаш боты ты як след,
І носіш плёткі, нібы ружы,
Ты — падхалім, а не паэт…

Калі па ветры нос трымаеш,
Не бачыш гора, нечых бед,
Калі ўсё круціцца, віхляеш,
Ты — проста флюгер, не паэт…

Калі кагосьці забаўляеш
І весяліш вакольны свет,
Калі ты словам пацяшаеш,
Ты — скамарох, а не паэт…

Паэт… Ён ісціне не здрадзіць,
Праўдзівы, смелы… Ён такі.
Паэт крывёй за слова плаціць,
Жыццём — за шчырыя радкі…

***

Вашы плёткі
Мяне не цікавяць:
Хто развёўся
І хто што сказаў,
І каго з вас
У друку там хваляць…
Мне цікавей
У ціхіх лясах

Слухаць шорах
І шэпт лістападу,
Шум дажджу,
Гулкі стук жалудоў
І пранізлівы крык
Журавоў
Дзесь у высях,
За вёскай,
Над садам…

І ўсе гэтыя
Фарбы і гукі,
І самота
Вячэрніх палёў
Мне бліжэй
За ўсю вашу дакуку
Мітуслівых
І думак, і слоў…

Што мне гульні
І вашы забавы?..
Смешна слухаць
І смешна глядзець…
Лепш паслухаю,
Як між атавы
Будзе ветрык
Мне штось шапацець…

Лепей крочыць
Асенняй дарогай,
Ціха словы шаптаць
І радкі…
Я далёкі ад вас,
Слава Богу,
Слава Богу,
Што я не такі…

Выбар

Згубіць сябе так лёгка,
Знайсці — архіскладана…

Жыццё пражыць, як лёкай,
Гнуць спіну, як на пана,
Рабом быць без'языкім,
Прыніжаным, бязлікім,
З пакрыўджанай душою,
Не быць самім сабою —
Ты гэтага жадаеш?..

Адкрытым быць, як рана,
Сумленным і праўдзівым,
Адрынутым і гнаным,
А значыць — нешчаслівым,
Штодня сцякаць крывёю,
Затое быць сабою —
Ты гэта выбіраеш?..

Твой верш

У кожнага свой крыж,
Свой лёс, свая Галгофа…
Ад лёсу не ўцячэш…
Таму цягні свой воз,
Складай радкі і строфы,
З мелодыі душы
Майструй свой лепшы верш…

Дабаў шчэ пачуцця,
Узнёсласці, натхнення,
І шчырасці ліні,
І з фарбай размяшай,
Пра смеласць не забудзь,
Галоўнае ж — сумленне,
Якое з горкай праўдай
Ты да ўсяго дадай…

Тады і выйдзе верш,
Той самы, запаветны,
Які не падвядзе —
Бяры яго з сабой…
Ён лёс твой і жыццё,
Ён хлеб твой і паветра,
У даль вякоў імкне,
Як парус над вадой…

***

Калі вершы — як проза,
Дзе ні коскі, ні кропкі,
Як забава ці поза, —
Твае вершы — падробка…

Не паэзія гэта,
А штукарскія дзеі,
Як падманнае лета —
Ні цяпла, ні надзеі…

Ні душы, ні натхнення,
Адны фразы пустыя,
Як абрыўкі трызнення —
Словы ўсе нежывыя…

Калі ж верш палыхае,
Як касцёр прыдарожны,
Ты — паэт і, ты знаеш,
Што паэт не апошні…

***

Міхасю Канстанцінавічу Міцкевічу

На волю хочацца, за горад:
Дзе-небудзь выйсці… ў Цёмных Лядах
І ціха крочыць цёмным борам
Пад шэпт і шорах лістападу.

І думаць у цішы асенняй
Пра час няўмольна хуткацечны
І пра жыццё, што, як імгненне,
Пад небам велічным і вечным.

І разважаць пра лёс Айчыны,
Пра лёс паэта і народа.
І пад журчанне ручаіны —
Што ёсць няволя… і свабода…

Быць вольным у душы і ў песні,
Як вецер у асеннім лесе,
Як сокал вольны ў паднябессі…
Калі ж інакш — не трэба песень…

На волю хочацца, за горад:
Дзе-небудзь выйсці... ў Цёмных Лядах
І ціха крочыць цёмным борам
Пад шэпт і шорах лістападу…

***

Жыць трэба з навізною:
Хоць нешта, а рабіць…
Калі жыццё пустое,
Тады навошта жыць?..

Без годнасці, сумлення,
Без музыкі ў душы,
Без песні і натхнення?..
Не, гэтак нельга жыць…

Жыць так, нібы вясёлка
Над шляхам зіхаціць…
Жыць кожны дзень, як пчолка,
Жыць, адным словам, жыць!..

ШЧЫМЛІВАЙ ПЕСНІ АДГАЛОССЕ

Марыя АНТАНАС

***

Я да цябе са Словам, век:
Мяне вазьмі, як кроплю рэк,
Як зернечка Зямлі сваёй,
Пасей у свеце Дабрынёй!
Хачу, усюды каб цвілі
Сады людское цеплыні!

***

Я не хацела Вас забыць…
Само забылася, няйначай…
Не, сэрца болем не шчыміць,
Не плача!
Каб боль трымаў мяне далей,
Былі б патрэбны нам сустрэчы.
А мне ўсяго цяпер мілей
Лілеі прыпяцкія ўвечар!
Туды вяртаюся заўжды
У час душэўнай прахалоды.
Ах, як цвітуць мне там сады
І песні пахнуць мёдам!
Што крыўдаваць мне на чужых!
Не ручкі ў нас цалуюць — сэрцы!
А Вы былі ў мяне як міг,
Каб забываць яго да смерці!..

***

Пераживу. Перацярплю.
Не ўзвыю дзікаю ваўчыцай.
Прылягу ціха на зямлю
Лячыцца.
Чабрэц, і мята, і палын —
Усё пад сэрцам, пад рукою.
І ў вышыні — журавак клін,
І я ля іх ужо — душою.
Не гора — высака любіць,
І не бяда, хоць безадказна.
…Якое шчасце — не забыць
Цябе, адзіны, з часам!

***

Абарвалася нітка адчайная,
Абарвалася тайная!
Мне і тайнае — не дазволена…
Як ты, сэрца маё, засолена!
Анікога нідзе на свеце.
Я. Дачушка. І вецер.
Выбачайце, каго любіла,
Выбачайце, каго забыла.
Анікога нідзе на свеце.
Я. Дачушка. І вецер.

***

Гэта людзі… Звычайныя людзі,
Што ўсіх судзяць, разумныя ўсе…
Ах, давай мы на іх забудзем,
Пабяжым з Табой па расе!
Ты сустрэнь мяне сёння ласкай
І даверам сваім сагрэй.
Зацвіту я маёвай краскай
Ля Тваіх, мой харошы, дзвярэй.
Ты не вер, што зусім зачынілася
Ад людзей — на ўсе я замкі!
…І чаму толькі сёння прыснілася,
Што і Ты мне не даў рукі?!

***

Я так многа хацела сказаць!
Каласуе як жыта, цвіце сенажаць,
Як мой бацька са мною касу йдзе
кляпаць,
Як матуля сярпок мяне вучыць
трымаць,
Як гамоніць рачулка, як шэпча зямля,
Каб зярнятка я сеяла, колас — пляла!
…Столькі часу мінула з той дзіўнай
пары!
Празвінела дзяцінства званком у бары,
Праспявала таполяй юнацтва ў акне.
Як жа так, што
нічога ў мяне?!.

***

О, мой сум чорна-жоўты!
Маё гора!
Назаўсёды пайшоў Ты
У зоры.
З адзінокаю песняй,
Што нясцерпна баліць,
Мне палескай Алесяй
Па Табе век тужыць.
Несагрэтаю казкай,
Без цяпла, без святла.
О, дачушка, будзь краскай,
Шчаснай, дзе я ўзышла!

***

Я так хацела яблыняю быць!
Раджаць свой квет — бялёса і шчасліва!
Каб нехта мог мяне любіць,
Як дзіва.
Я так хацела яблынькаю быць!
Чаму ж ты, радасць, мяне міма?
А ты, ці будзеш калі сніць
Мяне, Радзіма?
Дачушка родная, прабач,
За невыноснасць майго стану…
Прад кветам яблыні паплач,
Калі мяне не стане…

Альжбета КЕДА

Здымак

Яна магла бясконца ўглядацца ў твары, вочы гэтых незвычайна прыгожых маладых людзей. Двое мужчын і адна дзяўчына. І тады, калі атрымала гэты водгук з далёкае, даваеннае пары, і пазней, калі ўжо ведала, як пераблытаў лёс іх шляхі, як перакруціў, пераплёў, завязаўшы ў вузел, каб ураз жа яго і рассекчы. Яна не проста глядзела, а імкнулася дайсці: пра што яны думаюць зараз, што было перад тым, калі фатограф выхапіў гэтае імгненне, і што было пасля. Хто падаў ёй руку, хто і што сказаў ёй — адзінай паненцы між гэтых прыгожых хлопцаў? Цікавілі звычайныя жаночыя пытанні: якога колеру яе цёмная сукенка з белым карункавым каўнерыкам, што быў заколаты пасярэдзіне брошкай з пярлінавымі вочкамі? І завушніцы таксама з пярлінкамі. Хто так прыгожа прыбраў каронаю вакол галоўкі яе шыкоўныя валасы? Якія туфлікі на яе ножках?

Ад самага пачатку дакладна ведала толькі імя жанчыны — Гелена. Была тая стрыечнай бабулінай сястрой аднакласніцы, ад якое і атрымала здымак: «Ты збіраеш даўняе, відаць, табе будзе цікава». Яшчэ як цікава! Здымкаў тае пары ў яе Шчонаве лічаныя, дзясятка не набярэцца. А тут такі якасны, выразны, зроблены няйначай прафесіяналам. Дзе зроблены? Ніякага надпісу, ні рамачкі ці хоць якога знаку...

Нават прозвішча аднакласніца не назвала, бо сваячка бабулі была па кудзелі. То і згубілася яно, у той даўняй кудзелі заблытаўшыся. Сям'я Гелены з'ехала ў сярэдзіне трыццатых гадоў недзе пад Баранавічы, дзе бацька служыў аканомам у пана. Яна тады ўжо не ў Шчонаве жыла, замуж кудысьці выйшаўшы. Гэта было ўсё, пра што даведалася. Аднакласніцы хапала і таго, што памятала імя бабулі і дзеда. Глыбейшае не цікавіла.

З пяці не заўсёды надзейных крыніц, шчонаўскіх доўгажыхарак, толькі апошняя, цётка Волька Харанджукова, да якой даехала ў Наваградак, пазнала, хто справа ля Гелены:

— Дык гэта ж яе мужык, Костусь Сасімовічаў. О, яго то я добра памятаю, хоць малая тады была, бо ён да мае старэйшае сястры спачатку заляцаўся. Спадзяваліся бацькі, што замуж возьме… А той, як Гэлю ўгледзеў, то на Агату нашу і не глянуў болей. Надто харошая тая Гэля была. Шмат хто на яе заглядаўся... Сасімовічы прыязджалі на Спаса да сваякоў у Шчонава, на гуляні Костусь яе і ўпадабаў. А ішоў да Агаты…

Адразу згадала: шэкспіраўскі сюжэт па-шчонаўску: Рамэа забывае Разаліну, угледзеўшы Джульету... Даведалася, што сям'я Гелены жыла ў сядзібе на ўскрайку Захомаў, недалёкага ад Шчонава лесу. Бацька яе Пахалінскі і ў тутэйшага пана Ждана аканомам працаваў. Замуж за Костуся пайшла ў фальварак за Цырынам. Аўдавеўшы, адна ўсё жыццё пражыла з сынам. Той быў ажаніўся, развёўся, сын у яго быў. Не ведала цётка Волька, дзе той сын, Гэлін унук, бо радні блізкае ў нашых ваколіцах не засталося. Згубіўся след…

— Хто думаў тады, як Агату Костусь пакінуў, што на добрае гэта выйдзе. Бо забілі Костуся на вайне, а яе мужыка нат не паранілі. Хоць таксама на вайну быў узяты…

Вось жа, адзін з мужчын на здымку, той, што справа, Канстанцін Адамавіч Сасімовіч, муж Гелены. Загінуў ва Усходняй Прусіі 25 кастрычніка 1944 года. Адкуль такія дакладныя звесткі? З кнігі «Памяць» іх раёна.

Падавалася б, дастаткова даведалася, каб адкласці гэты здымак, супакоіцца і пакінуць у спакоі тых, каго ўжо даўно няма. Але спакою не было. Ёй чамусьці вельмі хацелася ведаць, хто быў трэці, што звязвала гэтых людзей. Але ніхто са старэйшага пакалення таго маладога хлопца не прызнаў. Ужо і надзею страціла. На сваёй інтэрнэтнай старонцы яшчэ раней стварыла суполку «З даўнейшага». Многія туды заглядвалі. Знаёмыя і незнаёмыя. Выкладала здымкі. Каб лепей было зразумела, хто ёсць хто, падпісвала не толькі прозвішчы, імёны, але і мянушкі. Любіла шчонаўскія мянушкі. Па-рознаму яны гучалі. То ласкава — Леснічок, Чорненькі, то грубавата — Корч, то са смяшынкай — Чубко, то ганарова — Ахвіцэр, Пасэсар, Барын. Апошняя мянушка якраз і дапамагла разгадаць, хто трэці на здымку. Як аказалася, зусім не тога чалавека за Барына прымала. На трох здымках той быў. Ды вось адгукнуўся аднойчы незнаёмы мужчына:

— Вы часам згадваеце мянушку майго дзеда Міхася — Барын. Ведаю, што так нас называлі. Ад бабулі чуў. Але гэта не той чалавек, якога Вы пазначаеце. Той, мой дзед, іншы, на вашым здымку таксама ёсць. Мяне ў гонар яго Міхасём назвалі. Праўда, на радню бацькаву я не падобны. Па маме я.

І пазначае — каго б вы думалі!? — тога трэцяга мужчыну з яе здымка, што поруч з Геленай. Гэта было так неспадзявана! З маладзейшага пакалення мала хто мянушкі шчонаўскія ведае, мала хто і здымкі даўнейшыя мае. Таму гэта падалося ёй праўдзівым цудам: знайшоўся згублены для шчонаўскае грамады чалавек усяго з трэцяга пакалення. Так параскіданыя яе шчонаўцы па свеце! І знайшоўся не дзесьці за марамі-акіянамі, а ў не такім і далёкім Санкт-Пецярбургу. Каранямі сваімі цікавіцца, здымкі беражэ. Праўда, да Шчонава ні разу так і не даехаў. Даслаў ён здымкі сваіх дзядулі (так, гэта той, трэці), бабулі. І бабуля ягоная, жонка Міхася Барына Аксіння, з Геленаю знаёмая была, сябравалі, на вяселлі іх са сваім мужам будучым пазнаёмілася. Перад вайною пабраліся. Таксама, як і Гелена, мужа страціўшы, разам з сынам жыццё пражыла. На старасці забраў ён яе ў Санкт-Пецярбург. Адтуль з Геленаю стэлефаноўваліся часам, перапісваліся, здымкі адна адной дасылалі. Сыноў сваіх, унукаў. І тыя здымкі даслаў таксама…

Там яна і ўгледзела тое, што не давала ёй спакою. Папрасіла спадара Міхася звесці яе з унукам Гелены, адрас даць, бо не прызнаваў той сацыяльныя сеткі. Напісаў яму, дазволу папрасіў, даслаў адрас...

Яна сустрэлася з Кастусём Сасімовічам, унукам Гелены і Кастуся, мінулым летам у Райцы, недалёкім ад Шчонава мястэчку, на Спаса — парафіяльным свяце. Не тое, што баялася гэтае сустрэчы. Не, проста не ведала, ці можна паведаміць яму пра іх сямейную таямніцу, якая адкрылася ёй, чужой кабеце, праз столькі гадоў. Напачатку яны абодва, унук Сасімовіча і ўнук Барына, прыехаць меркавалі. Але і гэтым разам даехаць на Радзіму бацькоў апошняму не выпала.

Калі яна хвалявалася і мусіла нешта хаваць, то гаварыла шмат, адводзячы ад галоўнага, адцягваючы час. Так і гэтым разам. Расказвала пра сваю кнігу, пра ягоных сваякоў, блізкіх і далёкіх, сувязі з якімі ён не меў, пра даўняе Шчонава і самотнае цяперашняе вёскі. Пасля свята яны збіраліся туды паехаць. Вырашыла, што скажа яму (калі ўсё ж асмеліцца) там. Глядзела ў ягоныя вочы, высокі, адкрыты твар, хвалістыя валасы. І бачыла ў ім таго, іншага, што не вярнуўся з вайны. Баялася загаварыцца і назваць яго Міхасём. Было ніякавата. Мужчына (а яны ж так любяць, каб іх слухалі) не надта імкнуўся падтрымаць размову. У нейкі момант ёй падалося: ён ведае, што яна хавае. Такім праніклівым быў ягоны пагляд. Яна змоўкла.

— Хочаце ведаць, што сказала мне бабуля Гелена перад смерцю?

Пытанне прагучала вельмі нечакана. Яна яшчэ нічога пра іх не сказала, баялася загаварыць пра Гелену, Кастуся, Міхася... Ён разумеў, што пытаць пра гэта было лішнім. Быццам выпрабоўваў.

— Вы ж хочаце назваць мяне Міхасём?

Гэта ўжо было занадта! Ён што, чытае яе думкі?

Гаварыць пачаў не так, як яна. Без хвалявання, стрымана:

— Бабуля глядзела на мяне вельмі ўважліва. Прыблізна як вы зараз. А яшчэ з такою любоўю і пяшчотай, як на мяне не глядзеў ніхто і ніколі. Прамовіла: «Міхасю...» Калі я памкнуўся пратэставаць, думаючы, што яна трызніць, бо я ж яе ўнук, Кастусь, яна сказала: «Ты ўнук Міхася Барына». І пачала гаварыць хутка, як вы зараз. Пра Міхася, якога кахала ўсё жыццё. Пра тое, што толькі з ім звязвала свае надзеі на замужжа, шчасце. А сябра ягоны, Кастусь, так яе ўпадабаў, што сватоў той жа восенню прыслаў. І бацькі адразу пагадзіліся: багаты быў, фальварак меў, ды і хлопец прыгожы, добры. Нічога не скажаш. Яна і не сказала нічога. Хто б яе слухаў? Бацькі вырашалі. За гонар ім было мець такога зяця. Як пабегла вечарам пасля таго сватання на спатканне да Міхася. Як рвалася на часткі яе сэрца. Як ён суцяшаў яе... І як сталася... Як страшна было ёй сказаць Кастусю пра той смяротны грэх. Ды ўсё ж сказала, ведаючы, што добры ён, не пракляне, не выдасць яе на ганьбаванне, што мо адмовіцца ад шлюбу. Не адмовіўся. Доўга маўчаў. Сказаў, што даруе, бо кахае. Але запатрабаваў ад яе клятвы, што будзе вернай яму ўсё жыццё. Стрымала клятву. Ні за кога не выйшла, удавою застаўшыся. Засталася вернай свайму Кастусю. І Міхасю. «І ты, унучак, даруй...»

Змоўк на хвіліну. Спытаў:

— Вы дзеля гэтага прасілі мяне прыехаць?

— ... І каб пра здымак распытаць...

— Гэты? — Ён дастаў са свайго кейса канверт, куды быў укладзены той жа здымак, у які бясконца ўглядалася. Яна ўжо не здзіўлялася...

— На Спаса быў зроблены. Калі Кастусь упершыню маю бабулю ўгледзеў. Фатографа з Наваградка запрашалі, у школе здымкі рабіў.

— Мо ведаеце, якога колеру была сукенка пані Гелены?

Задумаўся:

— Не, не памятаю, каб бабуля пра гэта казала. Тады ж, перад смерцю, здымак гэты мне аддала. Казала, што вельмі няёмка ёй было сядзець між імі. Бачыла, што Кастусь захапіўся ёю. Міхась іх і пазнаёміў...

Яны вырашылі пайсці да Шчонава пешшу. Шляхам, якім хадзілі Гелена, Міхась, а таксама яе бабуля Волька і той, каго кахала, ды за каго не выйшла...

А хто той, каго яна як Барына ўспрымала? Ніхто, ужо, пэўна, не падкажа…

Царква Святой Варвары ў Райцы (Карэліцкі раён).

САПРАЎДЫ АДКРЫТАЯ ПРАСТОРА

Гасцей фестывалю ўпершыню сустракае пляцоўка майстар-класаў і літаратурных гульняў, дзе можна зрабіць тактыльную паштоўку, навучыцца маляваць казачныя гарады ці прыдумаць уласны комікс. На моладзевай пляцоўцы фанаты «Уладара пярсцёнкаў» Джона Толкіена трэніруюцца ў мастацтве аргументацыі і публічных выступленняў. Неўзабаве студыя замежных моў «*Challenge*» запросіць аматараў англійскай мовы на пляцоўку чытанняў — даведацца пра страшнага звера *Gruffalo* і зрабіць міні-спектакль па кнізе.

На дзіцячай пляцоўцы прэзентуецца кніга «Мама Му паранілася» — з удзелам шведскай пісьменніцы Юі Вісландэр. Увечары на гэту пляцоўку завітае мастацтвазнаўца Соф'я Садоўская, якая раскажа пра кнігу «Казімір Малевіч для дзяцей» Адама Глобуса, Лявона Вольскага і Андрэя Хадановіча. А заўтра група экспертаў, у склад якой уваходзяць арганізатары фестывалю, у межах прэміі «Ліхтар» назаве лепшыя кнігі для дзяцей і падлеткаў, якія пабачылі свет на працягу года.

Удзельнікі фестывалю — людзі абсалютна розных прафесій. Прадзюсар і вядучы Канстанцін Каверын, трэнеры дэльфінаў Аляксандра Шулякоўская і Таццяна Рыжкевіч, мовазнаўца Уладзімір Куліковіч, брэнд-шэф рэстарана «*Staver*» Марына Ставер... Аб'ядноўвае іх вельмі важная якасць: кожны мае ўлюбёную кнігу, якую з задавальненнем прадставіць суразмоўцам.

Як атрымалася стварыць такое насычанае, яркае свята? Адзін з сакрэтаў — максімальная адкрытасць праекта ўсім творчым ініцыятывам. Каб стаць удзельнікам ці валанцёрам, дастаткова было звязацца з арганізатарамі і распавесці пра сябе альбо прапанаваць цікавую ідэю.

— Кожны год да фестывалю далучаецца больш неабыякавых, яны бяруць на сябе арганізацыю новых кірункаў і спецпраектаў. Альбо забіраюць частку працы і робяць лепш, чым атрымлівалася ў першапачатковага складу каманды. Фестываль прыцягвае цудоўных, апантаных кніжнікаў. Далучайцеся! — запрашае заснавальніца кніжнага свята Вольга Воўк.

Выдатна, што ў праграме фестывалю штогод павялічваецца колькасць беларускамоўных падзей. Сёлета свае праекты прадставяць Ганна Янкута, Маргарыта Латышкевіч, Кірыл Стаселька, Серж Мядзведзеў, Алеся Башарымава і многія іншыя маладыя, актыўныя, вынаходлівыя беларускія літаратары. Мэтры айчыннай літаратуры завітаюць на прэзентацыю зборніка «10 + 10: Мінск» — адмысловы спецпраект фестывалю.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Мінск — адна з асноўных тэм сёлетняга кніжнага свята. Напрыклад, праграма «Мівія» прапануе тактыльную экскурсію «Дакрануцца да Мінска», распрацаваную для людзей з асаблівымі патрэбамі, а клуб інтэлектуальнага адпачынку «Факультатыў» запрашае наведаць самую таямнічую мінскую гасцініцу, якая знаходзілася на месцы Дома ўраду.

Фестываль «Горад і кнігі» — свята сталічнае, хаця геаграфія ўдзельнікаў заўсёды была шырокая: Маладзечна, Віцебск, Баранавічы, Масква, Санкт-Пецярбург… На шчасце, сёння мінскі кніжны фестываль ужо не адзіны ў Беларусі. Досвед мінскіх бібліятэкараў запатрабаваны!

— Праз тыдзень кніжны фестываль адбудзецца ў Гомелі, а летась такія фестывалі праходзілі ў Гродне і Віцебску, — распавядае спадарыня Вольга. — Наша каманда гатова дапамагчы тым, хто бярэцца за справу. Адна з нашых любімых фраз: «Хай кніжнікаў становіцца больш і больш!» У арганізацыі фестывалю нам дапамагае больш за 150 чалавек. Проста так, з любові да кніг і чытання. І мы заўсёды падтрымліваем тых, хто звяртаецца. Так і робяцца вялікія кніжныя справы!

Наколькі складана арганізаваць у сваім горадзе кніжны фестываль? Вольга Воўк найперш згадвае пра бюджэт:

— Рабіць фестываль з фінансаваннем прасцей, чым безбюджэтны. Лёгка штосьці прыдумаць, а вось знайсці рэсурсы і людзей на рэалізацыю — гэта сапраўдная прыгода. Мы проста хочам жыць у горадзе, дзе кніжны фестываль ёсць. Таму галоўная якасць арганізатара бескаштоўнай безбюджэтнай падзеі — гэта вера і агонь у вачах.

Пляцоўкі, дзе ў рэжыме нон-стоп адбываюцца прэзентацыі кніг, сустрэчы з пісьменнікамі і літаратурныя гульні, магчыма арганізаваць на Нацыянальным фестывалі паэзіі і песні ў Маладзечна, на шматлікіх гістарычных і фальклорных святах. Да кожнай тэмы можна знайсці адпаведныя кнігі — а значыць, зацікаўленых аўтараў і захопленых чытачоў!

Алеся ЛАПІЦКАЯ

Засваенне новых паэтычных абсягаў: гімн Бангладэш па-беларуску

Незалежнасць, суверэнітэт часам набываюць досыць эмацыянальную, паэтычную афарбоўку. Дзесяцігоддзямі як гімн памкненняў беларусаў да вольнага жыцця гучыць верш Янкі Купалы «А хто там ідзе?». Нешта падобнае адбылося і з гісторыяй верша Рабіндраната Тагора, які зрабіў сваім прачулым словам усё магчымае для ўслаўлення свабоды, волі народа Бангладэш. Невыпадковым падаецца і тое, што твор «Мая залатая Бенгалія» стаў гімнам новай краіны — Бангладэш, якая параўнальна нядаўна, амаль пяцьдзясят гадоў назад, атрымала незалежнасць. Гімнам верш стаў праз многія гады пасля смерці лаўрэата Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры Рабіндраната Тагора.

Прапануючы чытачам розных краін беларускае пераўвасабленне неўміручага твора, здзейсненае лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міколам Мятліцкім, хацелася б адзначыць, што існуюць і іншыя пераклады «Маёй залатой Бенгаліі» на беларускую мову. Іх ажыццявілі паэты Навум Гальпяровіч і Марыя Кобец. Дарэчы, гэтая публікацыя — як частка і анонс новага творчага праекта: у адным з кніжных выдавецтваў краіны рыхтуецца да выдання кніга аднаго верша Рабіндраната Тагора ў перакладзе на мовы народаў свету. Ужо далучыліся да рэалізацыі гэтага клопату і іншыя перакладчыкі, перастварыўшы легендарны твор на свае родныя мовы, — на сербскую (Даяна Лазарэвіч), чувашскую (Валеры Тургай), татарскую (Роберт Мінулін), агульскую (Шаміль Лутаў), армянскую (Эдвард Мілітанян), туркменскую (Агагельды Аланазараў), калмыцкую (Рыма Ханінава).

Сяргей ШЫЧКО

Рабіндранат ТАГОР

Мая залатая Бенгалія,
Я закаханы павек.
Заўжды тваё неба, паветра
Ў душы маёй граюць на флейце.
О маці, лясы твае мангавыя
Сакавік водарам поіць, ах!
О маці, у лістападзе налітаму полю,
Якое пабачыў, я усміхаюся шчыра.
Пышнасць якая, якое сутонне,
Якая пяшчота, сіла магічная —
Быццам сары краёк ты разгарнула бліз каранёў баньянаў
Ля прыбярэжжа ракі.
Матуля, вуснаў тваіх словы
Для слыху майго — нектар,
Ах!
Матуля, калі чало тваё светлае агортвае смутак,
О родная, я слёзы глытаю.

З бенгальскай.
Пераклад Міколы Мятліцкага

Перакладчык адкажа ўзаемнасцю

Фота Кастуся Дробава.

Падчас прэзентацыі.

Сяргей і Таццяна Дзюбы — вядомыя асобы ў літаратурным асяроддзі Украіны. Пазнаёміцца з творчасцю гэтых шматкроць уганараваных паэтаў могуць і беларускія чытачы — дзякуючы кнізе «Горад Зіма». Перакладчыкам вершаў гэтай сямейнай пары выступіў Міхась Пазнякоў. У сваю чаргу, украінскім чытачам прапануецца кніга Міхася Пазнякова «Цяпло рамонкавай завеі», узноўленая на ўкраінскай мове. Абодва выданні выйшлі з друку ў лістападзе мінулага года. Пра паралельную перакладчыцкую працу і творчае сяброўства паэты (яны ж перакладчыкі) распавялі падчас прэзентацыі кніг у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа.

— Насамрэч гэта сустрэча распачалася два гады таму ў Канадзе, — адзначыў Анатоль Аўруцін, аўтар прадмовы да кнігі «Горад Зіма». — Сяргей, Таццяна і я апынуліся ў спісе лаўрэатаў Канадскай літаратурнай прэміі імя Эрнэста Хэмінгуэя выдавецтва «*Litsvet*». Вырашыў пазнаёміцца з украінскімі калегамі, а потым прадставіў ім Міхася Пазнякова. Так пачалося наша літаратурнае сяброўства, якое мае сёння выдатныя вынікі.

Сяргей Дзюба ўзначальвае Міжнародную літаратурна-мастацкую акадэмію Украіны і працуе намеснікам галоўнага рэдактара Чарнігаўскай абласной газеты «Дзяснянская праўда». Таццяна Дзюба — доктар навук па сацыяльных камунікацыях. Абодва аўтары скончылі факультэт журналістыкі Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі, які і паяднаў іх на многія гады. Сяргей і Таццяна Дзюбы — паэты, перакладчыкі, крытыкі, публіцысты.

Падчас прэзентацыі прагучала шмат слоў удзячнасці:

— Міхась Пазнякоў добра адчувае мову, яго пераклады зробленыя тонка і вельмі меладычныя. Многія яго вершы простыя, але ўсё геніяльнае — проста. У кнізе «Цяпло рамонкавай завеі» ёсць і творы філасофскія, яскравыя, вельмі вобразныя. Наогул, сёння шмат таленавітых аўтараў, чые творы поўняцца негатыўнай энергетыкай, а ў Міхася Пазнякова — светлая, пазітыўная энергетыка, таму яго вершы перакладаць радасна, — адзначыў Сяргей Дзюба.

Таццяна Дзюба распавяла пра сваю творчасць і нагадала, што літаратура — «мост, які абядноўвае народы». Сям'я Сяргея і Таццяны Дзюбаў магла патрапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса: усе 74 кнігі Сяргея Дзюбы прысвечаны жонцы, і ў свеце няма іншай жанчыны, якой было б прысвечана так шмат літаратурных твораў.

Паралельны пераклад кніг і адначасовая прэзентацыя двух узаемна перакладзеных выданняў — пашыраная практыка ў Міжнароднай літаратурна-мастацкай акадэміі Украіны. Аўтарам і перакладчыкам прыемна, чытачам — карысна, а творчы дыялог ператвараецца ў палілог, бо ў арбіту літаратурнага сяброўства трапляюць новыя аўтары.

Янка НАТАВЕЦ

Сярод асоб

Ужо не першае дзесяцігоддзе ў беларускай літаратуры прыкметна не стае мастацкай публіцыстыкі. Не, кнігі, якія расказваюць пра сучасніка, жыццё ў розных рэгіёнах краіны, гісторыю айчынных прадпрыемстваў, выходзяць. Такіх кніжных выданняў звышдастаткова. На жаль, няма ці амаль няма той публіцыстыкі, якая традыцыйна не сыходзіла са старонак літаратурных часопісаў, была выкладзена ў форме сур'ёзных праблемных нарысаў. Дастаткова ўспомніць такіх аўтараў, як А. Шагун, Л. Левановіч, У. Саламаха, А. Сілянкоў, В. Карамазаў, Я. Сіпакоў… Публіцыстыка сягала за межы часопісаў, газет, збіралася ў кнігі і знаходзіла свайго шырокага чытача. Досыць часта і аўтары, якія дагэтуль працавалі выключна ў газеце, збіралі альбо дапаўнялі напісанае ў кнігах.

Таму на фоне адсутнасці тых ранейшых з'яў кожная з кніг, якую журналіст адважыўся сабраць з газетных ці часопісных публікацый, уяўляецца цікавай, вартай увагі з'явай.

Вось і я, раней знаёмы па «Звяздзе» з гутаркамі, інтэрв'ю кандыдата філалагічных навук Таццяны Падаляк, з задавальненнем перачытваю яе тэксты ў кнізе «Дыялогі на мяжы стагоддзяў: класікі і сучаснікі ў інтэр'еры часу» (другая частка; першая выйшла некалькі гадоў таму).

Таццяна Падаляк, працуючы ў аддзеле культуры ўрадавай і парламенцкай газеты «Звязда», зразумела, шукала суразмоўцаў у большай ступені сярод людзей творчых, актыўных у сваіх пошуках па вызначэнні галоўных адметнасцяў часу. Чытаем у гутарцы з Алесем Савіцкім: «Памяць ёсць не толькі ў людзей, яна ёсць і ў вольнай зямлі. Няма памяці толькі ў зямлі заваяванай, што скрылася чужынцу… У віхурныя часы выжывае тая зямля, якая памятае. І выжывае толькі той народ, які гэтай Памяці не здраджвае. Без гістарычнай памяці ў народа адзін шлях — рабства і выміранне». Сцяпан Лаўшук: «З чаго вы ўзялі, што мы кожны раз перапісваем гісторыю?!. Я ж, наадварот, да гэтага і падводжу, што мы, назапашваючы новыя і новыя факты, уздымаемся на новы ўзровень спасціжэння матэрыялу. Таму што факт — упартая рэч: калі твор напісаны, другім ён ужо не будзе. Канешне, пры змене сацыяльных, эканамічных, палітычных умоў у грамадстве мяняюцца і погляды, гэта непазбежна…» Вячаслаў Рагойша: «Перакананы, перспектывы ў роднай мовы ёсць. Але вельмі важна, каб кожны з нас, беларусаў (і асабліва работнікі культуры, навукі, асветы), самі былі і носьбітамі, і актыўнымі папулярызатарамі мовы — каб перадавалі яе ў спадчыну сваім дзецям і ўнукам…» Таццяна Шамякіна: «… мне здаецца, што метады нашага выхавання вызначаліся не стаўленнем бацькоў да кожнага, а нашымі ўласнымі душэўнымі якасцямі, якія закладзены генетычна, дараваны Богам, прыродай, зоркамі. Пры гэтым бацькі, безумоўна, імкнуліся быць аб'ектыўнымі і справядлівымі…» Алесь Петрашкевіч: «Мы дрэнна ведаем сваю гісторыю. Сапраўдную гісторыю ад нас хавалі і ў царскі, і ў савецкі час. Гістарычная праўда была непрыдатнай. Для мяне як для драматурга вельмі важна, каб людзі ўспрымалі сваю гісторыю эмацыянальна. Гісторыя наша настолькі цікавая, багатая і настолькі нераспрацаваная ў літаратуры — непачаты край работы…» Розныя суразмоўцы — і розныя ацэнкі часу. Гэтым зборнік гутарак і цікавы. На яго старонках сыходзяцца пазіцыі, меркаванні.

Таццяна Падаляк, рыхтуючыся да размоў з рознымі сваімі героямі, праявіла выключную дасведчанасць, здолела сабраць усе магчымыя звесткі пра лёсы сваіх суразмоўцаў, іх навуковыя і творчыя зацікаўленні. Часта пытанне і адказ сутыкаюцца ў канфлікце, супярэчанні. Тым і цікавейшымі становяцца гутаркі, інтэрв'ю. Упэўнены, кожнаму з чытачоў яны дапамогуць пераканацца, што «культура — гэта асяроддзе пражывання чалавека, яго цела і яго духу. Гэта сістэма каштоўнасцей…» (Міхаіл Савіцкі).

Кастусь ЛАДУЦЬКА

З кім нас чакаюць сустрэчы пад сімпатычнай вокладкай «Дыялогаў…»?

Мікола Аўрамчык, Алесь Савіцкі, Уладзімір Карызна, Уладзімір Гніламёдаў, Сцяпан Лаўшук, Вячаслаў Рагойша, Таццяна Шамякіна, Алесь Петрашкевіч, Аляксей Дудараў, Янка Казлоў, Раіса Баравікова, Леанід Дранько-Майсюк, Міхась Башлакоў, Адам Глобус, Лідзія Возісава, Іван Міско, Нінэль Шчасная, Алег Аўдзееў, Валянціна Гаявая, Наталля Гайда, Эдуард Зарыцкі, Аляксандр Саладуха, Генадзь Аўсяннікаў, Наталля Качаткова, Андрэй Кавальчук… Пісьменнікі, мастакі, кампазітары…

МАСТАЦТВА — У КНІЗЕ

Што знаходзіцца на старонках серыі «Культурная спадчына Беларусі»?

Мастацтва не жыве ў творчым вакууме: дзеля існавання яму, бы паветра, патрэбныя грошы. Дапамога мецэнатаў — неацэнны ўнёсак у дзейнасць пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў ды іншых творцаў. Удзел у культурным жыцці краіны бяруць і ўстановы, якія, на першы погляд, не маюць да яго наўпроставага дачынення. Так, Банк развіцця з 2015 года ажыццяўляе сацыяльны праект «Культурная спадчына Беларусі», у межах якога з непасрэдным удзелам вядомага беларускага выдавецтва «Чатыры чвэрці» штогод выходзяць адмысловыя кнігі-альбомы, прысвечаныя выбітным з'явам і дзеячам нацыянальнай культуры і мастацтва. Пра мэты і перспектывы праекта распавяла намеснік старшыні праўлення Банка развіцця Наталля Ясінская.

— Першым выданнем праекта «Культурная спадчына Беларусі» стала кніга-альбом «Аляксандр Кішчанка. Летапісец XX стагоддзя», прысвечаная творчай дзейнасці народнага мастака Беларусі, уладальніка медаля Францыска Скарыны А. М. Кішчанкі. Прэзентацыя кнігі адбылася ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Новае выданне пазнаёміла чытача са шматграннай творчасцю вялікага майстра, які пакінуў глыбокі след у беларускай культуры. На наступны год мы звярнулі ўвагу аўдыторыі на багатую гісторыю сярэднепрыпяцкага Палесся: на старонках «Тураўскай рапсодыі» ў форме лірычнага апавядання, заснаванага на вядомых гістарычных фактах, раскрываецца роля Турава і Тураўшчыны як старажытнай калыскі айчыннай дзяржаўнасці і культуры. Другое выданне серыі прадставілі на прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да 5-годдзя Банка развіцця, што падкрэсліла значнасць праекта «Культурная спадчына Беларусі» для кіраўніцтва банка. Напярэдадні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання мы вырашылі далучыцца да актуальнай тэмы і адлюстраваць гэтую значную падзею ў межах нашага культурнага праекта. Трэцюю кнігу серыі прысвяцілі старажытнай Полацкай зямлі, радзіме ўсходнеславянскага першадрукара Францыска Скарыны і больш як тысячагадовай гісторыі Прыдзвіння. Прэзентацыя кнігі-альбома пад назвай «Сімфонія стагоддзяў» прайшла падчас адкрыцця новага будынка філіяла Банка развіцця ў горадзе Віцебску.

Выданні праекта «Культурная спадчына Беларусі» былі добра прынятыя як чытачамі, так і спецыялістамі ў галіне кніжнай справы. Усе кнігі серыі атрымалі ўзнагароды на рэспубліканскіх і міжнародных кніжных выстаўках. Першы альбом «Аляксандр Кішчанка. Летапісец XX стагоддзя» заваяваў «Залаты фаліянт» у намінацыі «АРТ-кніга» 55-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі — 2016», які ладзіўся падчас XXIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Другі альбом «Тураўская рапсодыя» адзначаны дыпломам I ступені XIV Міжнароднага конкурсу дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў «Мастацтва кнігі» ў намінацыі «Надрукавана ў Садружнасці», а таксама дыпломам I ступені 56-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі — 2017» у намінацыі «За ўклад у захаванне духоўнай спадчыны». Сёлета ў гэтай намінацыі на XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы дыплом пераможцы і памятны знак-сімвал «Малы залаты фаліянт» атрымала трэцяя кніга серыі «Сімфонія стагоддзяў».

Прызы і ўзнагароды, якія атрымалі кнігі-альбомы серыі «Культурная спадчына Беларусі» — вынік плённага супрацоўніцтва Банка развіцця з выдавецтвам «Чатыры чвэрці». Кіраўніцтва выдавецтва, яго калектыў на працягу ўжо дваццаці пяці гадоў ствараюць і ажыццяўляюць праекты, скіраваныя на адраджэнне нацыянальнай культуры, папулярызацыю мастацтва і літаратуры. Дзякуючы іх намаганням усе кнігі серыі «Культурная спадчына Беларусі» выйшлі ў свет з унікальнымі тэкставымі раздзеламі на беларускай, рускай і англійскай мовах, дапоўненыя маляўнічымі фатаграфіямі, архіўнымі дакументамі, картамі. Каб зрабіць выданні больш інфармацыйнымі, супрацоўнікі выдавецтва праводзяць велізарную навукова-даследчую працу, фатографы выязджаюць на аб'екты, і таму альбомы праекта займаюць годнае месца не толькі ў калекцыях аматараў культуры Беларусі, але і ў яе знатакоў.

— За паўсядзённым клопатам мы не павінны забыць пра тое, без чаго немагчыма ўявіць паўнавартаснае існаванне чалавека, — нацыянальную культуру. Сёння як ніколі важна памятаць гісторыю сваёй краіны і яе вялікіх сыноў, таму мы не збіраемся спыняцца на дасягнутым. Сёлета прадставім новую кнігу-альбом серыі «Культурная спадчына Беларусі», якая дасць магчымасць любому чытачу за межамі нашай краіны пазнаёміцца з гісторыка-культурнымі і прыроднымі каштоўнасцямі Беларусі, уключанымі ў Сусветную спадчыну ЮНЕСКА.

Цяпер кнігі-альбомы серыі «Культурная спадчына Беларусі» можна знайсці ва ўсіх буйных кнігарнях краіны, да таго ж новыя выданні штогод дасылаюць у дыпламатычныя прадстаўніцтвы, консульскія ўстановы і філіялы міжнародных арганізацый у якасці падарунка.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

Мастацкія практыкі

Алена РУСАКЕВІЧ

ЯКУЮ РОЛЮ АДЫГРЫВАЕ КУРАТАР?

Арганізацыя маштабных выставак і выставачных праектаў сучаснага мастацтва патрабуе вялікіх часавых і фінансавых выдаткаў. Нярэдка засяроджванне ўвагі на арганізацыйных аспектах мерапрыемства (фарміраванне медыйнай прасторы, камунікацыя з мастакамі і выставачнымі пляцоўкамі і г. д.) становіцца перашкодай на шляху стварэння добрай выстаўкі або арт-праекта. Па гэтай прычыне такі важны этап, як вызначэнне характару мерапрыемства, становіцца другарадным або ігнаруецца зусім. Вельмі важна дакладна вызначыць, які матэрыял і з якой мэтай павінен быць прэзентаваны на выстаўцы, а таксама зразумець, якую ролю ў арганізацыі гэтага праекта іграе куратар.

У такіх сітуацыях арганізатары часта не толькі грэбуюць размеркаваннем абавязкаў і вызначэннем функцый, якія павінен выконваць кожны ўдзельнік мерапрыемства, але і, па нявызначанай прычыне, не кіруюцца мастацтвазнаўчымі навыкамі. Часам яны амаль не задумваюцца аб тым, што такія практычна энцыклапедычныя катэгорыі, як куратарскі праект і тэматычная выстаўка, адрозніваюцца па метадах арганізацыі, спосабу падачы, а таксама мэтамі і задачамі. Незразумела, чаму не ўлічваецца такая простая ісціна, што куратарскі праект прадугледжвае не толькі адбор твораў, але і стварэнне канцэпцыі, фарміраванне экспазіцыйнай прасторы, распрацоўку новай візуальнай мовы, якая будзе звязваць куратарскую ідэю, задумку мастака і гледача, а таксама тое, што куратарскі праект — самастойны мастацкі твор з уласным ідэйным напаўненнем і візуальным шэрагам. Таксама важна ўлічваць, што тэматычная выстаўка ствараецца для прэзентацыі твораў, аб'яднаных толькі адным крытэрыем: напрыклад, ідэйным пасылам або фабулай. Дзякуючы такім выстаўкам з'яўляецца магчымасць экспанавання работ вялікай колькасці аўтараў розных пакаленняў у адной прасторы.

Куратарскі праект Стэфана Антанэлі, прадстаўлены ў Палацы мастацтваў у рамках Міжнароднага фестывалю сучаснага мастацтва «Арт-Мінск», — прыклад такога нядбалага падыходу да важных этапаў стварэння куратарскага праекта. Пазнаёміўшыся з экспазіцыяй, задаешся пытаннем: справа ў куратары, які так імкнуўся перадаць лакальныя асаблівасці сучаснага мастацтва Беларусі, што ў яго атрымалася падобная прадстаўленым раней у гэтым жа выставачнай прасторы «Восеньскім салонам» выстаўка, ці справа ў сучасных беларускіх аўтарах, якія з году ў год прапануюць да ўвагі адныя і тыя ж творы?

Тут мы сутыкаемся з працай запрошанага куратара, які, мяркуючы па выніку, акрамя адбору твораў, не выконваў іншых, не менш важных функцый куратара. І калі меркаваць толькі па напаўненні экспазіцыйнай прасторы, таксама ўзнікае мноства пытанняў. Напрыклад, чаму ў выставачнай прасторы прадстаўлены шэраг твораў, якіх аб'ядноўвае толькі выставачная прастора? Незразумела таксама, чаму гэты куратарскі праект не мае выразна выяўленай канцэпцыі або пэўнай тэматычнай накіраванасці.

У выніку высакароднае імкненне прэзентаваць сучаснае мастацтва Беларусі выліваецца ў стварэнне гістарычнага зрэзу, які толькі суха канстатуе факты пра папулярныя мастацкія кірункі ў сучасным мастацтве нашай краіны і пра тэмы, якія хвалююць сучасных аўтараў.

«Час саджаць бульбу», 2016 г.

Васіль Пяшкун: «...Гэта жыццё, у якім няма месца абыякавасці»

Васіль Пяшкун умее размаўляць з прыродай. Праз маўклівы дыялог адчувае стан, настрой і глыбіню наваколля. Але не ставіць мэты цалкам адлюстраваць убачанае, ён чапляецца за дэталі, ледзь улоўныя, але такія важныя. Спецыялісты адзначаюць, што майстэрня Васіля Пешкуна не мае даху і сцен: адкрытыя прасторы для яго — магчымасць адпачыць маральна, раскрыцца. У межах праекта «Арт-Мінск» у галерэі мастацтваў «Прадмесце» ён прэзентаваў выстаўку жывапісу «Адкрытае неба», праз якую запрашае разгледзець цудоўнае ў звычайным, надзённым і простым. Зараз творца рыхтуецца да вернісажу, які хутка адбудзецца ў Нясвіжы. У прамежку паміж адкрыццём выставак мастак распавёў, чаму ў час развіцця новых кірункаў ён працягвае цікавіцца рэалізмам і якім творчым сакрэтам навучыўся ў любімай жонкі мастачкі Ганны Сілівончык.

— Чаму вы, будучы маладым мастаком, застаяцеся верным традыцыі? Ці былі спробы знайсці сябе ў іншых жанрах?

— Жывапіс можна параўнаць з музыкай. Класічны кірунак музыкі заўсёды застаецца актуальным, запатрабаваным. Тая ж сітуацыя і ў выяўленчым мастацтве: колькі б ні з'яўлялася новых творчых плыняў, класічны малюнак працягвае быць цікавым. Я выхоўваўся на творчасці класікаў, сярод якіх былі і «перасоўнікі», і імпрэсіяністы, таму гэты напрамак быў мне блізкі з першых творчых крокаў, не надакучвае і цяпер. Мне важна не страціць навыкі і ўменні, якія я атрымаў падчас вучобы і руплівай працы ў рэалістычным жывапісе.

Апошнім часам шмат увагі трэндам у сучасным мастацтве. Існуе меркаванне, што самы актуальны кірунак — абстракцыя. Але я лічу, што класічны жывапіс таксама магчыма назваць сучасным. У ім гэтак жа можна гуляць фарбамі, даследаваць фактурнасць. Мне цікавы кірунак, у якім працую. Вядома, часам магу задумацца, ці не звярнуцца да іншага жанру, але ў рэалістычным жывапісе яшчэ вычарпаў не ўсё, ёсць куды расці.

— Ці сутыкаліся з крытыкай з пункту гледжання абранага кірунку?

— Сутыкаўся з крытыкай творчасці. Але ніколі не чуў, што рэалізм выйшаў з моды і нікому не патрэбны. Наадварот, апошнім часам усё часцей атрымліваю словы падтрымкі. Тым больш што класічны кірунак выбірае далёка не кожны. Менавіта гэты факт робіць рэалістычны жанр актуальным і запатрабаваным. Мне падабаецца берагчы традыцыі і ў той жа час знаходзіць у творчасці душэўную свабоду.

Цяпер такія праекты, як «Восеньскі салон», «Арт-Мінск», у асноўным звяртаюць гледача да заходняга мастацтва. Гэта таксама фарміруе густ айчыннай публікі. Лічу, што класічнае мастацтва можа спаборнічаць з новымі тэндэнцыямі, мой праект у межах «Арт-Мінска» даказвае гэта.

— Многія вашы творы знаходзяцца ў калекцыях замежных краін. Як, напрыклад, у Еўропе ставяцца да класічнага жывапісу?

— На мой погляд, прысутнічае дваякае стаўленне да рэалістычных твораў. Часта сутыкаўся з тым, што людзі бачаць майстэрства і адразу ж, не задумваючыся, набываюць карціны. Але некаторыя глядзяць на іх як на мастацтва мінулага. Пасля імпрэсіяністаў не здзівіш рэалістычным мастацтвам. Мы з жонкай Ганнай выстаўляліся і ў Берліне, і ў Польшчы, і ў Венгрыі... Аня абстрагавалася ад рэальнасці, яе творы больш прыцягвалі, яны бліжэй па ментальнасці. Калі выстаўляліся ў Кітаі з дачкой і жонкай, іх творамі, зноў жа, зацікавіліся больш, чым маімі.

— А што датычыцца айчыннага рынку? Ці ёсць у вас свой глядач і пакупнік?

— У нашай краіне і краінах-суседках адчуваю цікавасць да сваёй творчасці: мае карціны прадаюцца. На постсавецкай прасторы народ да гэтага часу прыхільны да рэалізму. Чалавек, які нават мала захоплены мастацтвам, з задавальненнем паглядзіць на бярозы ці адчуе праз карціны пах бэзу. На абстракцыю ён будзе глядзець не так ахвотна, бо ў ёй трэба разбірацца.

— Што для вас галоўнае ў жывапісе?

— Перадаць стан і эмоцыі матыву, які пішу. Важна, каб, гледзячы на работы, чалавек не заставаўся абыякавы. Я нават не заўсёды ганюся за формай ці колерам, часта ўдакладняю дэталі, але абавязкова стараюся перадаць стан. Адштурхоўваюся ад натуры. Выдумляю досыць рэдка. Калі пішу рэальны пейзаж ці аб'ект, падзараджаюся энергіяй. Мяне натхняюць паходы на прыроду. Адчуваю, як вакол віруе жыццё. У межах цяперашняй выстаўкі я адправіўся працаваць на скрыжаванне вуліц Якуба Коласа і Куйбышава, запрасіў усіх ахвотных паназіраць за творчым працэсам. Гэта быў цудоўны дзень.

— Творчасць вашай жонкі Ганны Сілівочнык папулярная ў нашай краіне і за мяжой. Як вы ставіцеся да яе поспеху?

— Насамрэч я менш паспяховы, чым Аня. Спакойна гэта прызнаю. Яна, у адрозненне ад мяне, шмат сіл выдаткоўвае на прасоўванне і папулярызацыю творчасці. Калі я больш увагі аддаю жывапісу, то яна сумяшчае творчасць з распрацоўкай піяр-стратэгій. Дапамагае і мне прыдумаць адмысловыя мерапрыемствы для публікі.

Гэта нават цікава, што мы такія розныя. У Ані яркая індывідуальнасць, яна працаголік. А я не ўспрымаю жывапіс менавіта як працу, для мяне гэта адпачынак. Растваруюся ў сваіх творах, цалкам аддаюся працэсу. Цікава назіраць, як мяняецца пейзаж з заходам сонца, незабыўна атрымліваць у творы нечаканыя адценні. Мастацтва — гэта жыццё, у якім няма месца абыякавасці. Люблю наведваць новыя месцы, яны натхняюць на працу. Бывае, убачыў пейзаж і быццам перарадзіўся: хочацца ўзяць у рукі пэндзаль. Калі знаходзішся на прыродзе, ухапіць стан навакольнага свету прасцей, таму што ты сам унутры яго: чуеш, як падае лісце або цячэ рака, бачыш, як пакрывае зямлю туман...

— У вашых гарадскіх пейзажах сумяшчаюцца і прастата, і вытанчанасць, праз традыцыйную форму робіцца акцэнт на сучаснасці. Наўмысна ствараеце такі эфект?

— Сапраўды, я раблю гэта наўмысна. Дзесьці змазваю дэталі ці, наадварот, падкрэсліваю іх. Звярніце ўвагу на фары на гэтых палотнах: яны там быццам адны з галоўных герояў, ідзе гульня колераў. Яны надаюць карціне свячэнне, падкрэсліваюць вільготнасць мокрага асфальту, уносяць жвавасць у сюжэтную лінію… Літаральна год таму я пачаў пісаць невялікія па аб'ёме гарадскія пейзажы. Як кажа Аня, яны ў мяне добра атрымліваюцца. Малая работа — малыя памылкі. Пэўны памер ахапіць прасцей.

— Чаго не хапае сучаснаму беларускаму мастаку?

— Калі казаць пра майстэрства, то ў нас шмат годных мастакоў. Але ёсць праблемы, магчыма, з дэманстрацыяй айчыннага мастацтва ў кантэксце замежнага. Беларускіх мастакоў мала ведаюць у іншых краінах. Мяркую па сваіх знаёмых: мала творцаў прэзентуе сябе за мяжой. Вядома, гэта патрабуе высілкаў, складана беларускім мастакам рабіць такія крокі з-за абмежаваных фінансавых магчымасцяў. Мы варымся ў сваім соку, а гэта няправільна: мастак павінен ведаць, цікавы ён ці не.

Бывае, што аўтары выстаўляюцца толькі таму, што іх запрашаюць. А самі праявіць ініцыятыву баяцца ці лянуюцца. Я не кажу пра далёкія краіны. Чаму не паспрабаваць паказваць сябе ў Маскве ці Санкт-Пецярбургу, дзе мастацкае жыццё віруе? Напэўна, не хапае штуршка, матывацыі.

— На якім творчым узроўні цяпер знаходзіцеся вы?

— Я стаўлюся да сябе крытычна, таму мне здаецца, што знаходжуся на нізкім узроўні, калі параўноўваю сябе з Аняй. Прызнаюся, што ў нейкай ступені я гультай. І хоць у мяне шмат выставак, здаецца, што часам укладаю не столькі сіл, колькі б мог. Жонка мяне матывуе. Яна выдатны прыклад таго, як трэба працаваць. У Ані жыве азарт: калі пачала нешта рабіць, ёй складана спыніцца. Я ж больш спакойны, меланхалічны, імкнуся ў асноўным да жывапісу. Мяне стамляе адцягненне на іншыя рэчы.

Вікторыя АСКЕРА

«Мінскія будні», 2018 г.

«ТАЛЕРАНТНАСЦЬ» З ЕЎРАПЕЙСКІМ АКЦЭНТАМ

Карані глабальных канфліктаў даследуюць на беларускай сцэне

Прэм'ерны спектакль мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Мікалая Пінігіна «Талерантнасць», пастаўлены паводле п'есы французскай актрысы і драматурга Ясміны Рэза «Бог разні», на прыкладзе дзвюх звычайных еўрапейскіх пар узнімае пытанні сям'і і шлюбу, пачуцця віны і адказнасці за свае ўчынкі, паходжанне ўнутраных і знешніх канфліктаў асобы і ўсяго чалавецтва.

П'еса «Бог разні» выйшла ў свет у 2006 годзе і з таго часу паспела з'явіцца ў тэатрах Цюрыха, Парыжа, Нью-Ёрка, Масквы і Лондана, дзе стала лепшай камедыяй сезона 2008 года і атрымала тэатральную прэмію Лорэнса Аліўе. На папулярны твор звярнуў увагу нават Галівуд: галоўных герояў у фільме рэжысёра Рамана Паланскі «Разня» ўвасобіў зорны склад акцёраў — Кейт Уінслет, Крыстаф Вальц, Джодзі Фостэр, Джон Сі Райлі. Нарэшце п'еса трапіла і на беларускую глебу. Натуральна, што стварыў спектакль той жа рэжысёр, які ўпершыню прыўнёс у айчынную тэатральную прастору імя Ясміны Рэза праз пастаноўку «АРТ».

У беларускім варыянце «Бога разні» Мікалай Пінігін наўмысна замяніў назву: на думку рэжысёра, першапачатковы варыянт мог выклікаць у аўдыторыі непатрэбныя для ўсведамлення ідэі асацыяцыі з вайной (нягледзячы на тое, што беларусы сустрэліся з творам спадарыні Рэза пад загалоўкам «Талерантнасць», па патрабаванні аўтара афіша ўтрымлівае і арыгінальную назву твора). Іншым у купалаўскім тэатры атрымаўся і фінал п'есы.

Спектаклі накшталт «Талерантнасці» ставіць цяжка і складана: сюжэта ў яго стандартным разуменні тут амаль няма, а рухавіком падзей з'яўляюцца размовы паміж героямі дзеі. Таму асноўны акцэнт — усё ж на працы акцёраў: усё дзеянне разгортваецца выключна вакол іх дыялогаў, і аўдыторыю нельга «страціць» на слоўнай дарозе ад пачатку да канца дзеі.

...Заслона адкрывае наведвальнікам тэатра сучасны пакой з еўрарамонтам, дзе сядзяць чацвёра галоўных герояў — Вераніка (Вікторыя Чаўлытка, Яўгенія Кульбачная) і Мішэль Валон (Аляксандр Зелянко, Аляксандр Паўлаў), Анэта (Святлана Анікей, Марына Гардзіёнак) і Ален Рэй (Алег Гарбуз, Сяргей Чуб). Іх акаляюць усе патрэбныя праявы цывілізацыі: кава і шарлотка (з сакрэтам: дабаўляйце ў цеста пернікавае крышыва!), вазы з цюльпанамі па 10 еўра і каталогі сусветнага жывапісу (вядома, у айчыннай апрацоўцы п'есы без імя Суціна не абышлося), тэлебачанне і лепшая сантэхніка. Цывілізаванымі і вытрыманымі падаюцца першапачатковыя зносіны паміж людзьмі ў кватэры. Але што ёсць тая цывілізацыя? Ці не пераўтварылася яна ў фарс, дзе жанчыны і мужчыны, бы малпы з афішы спектакля, з дапамогай выхавання і этыкету спрабуюць гуляць у лэдзі ды джэнтльменаў? Тут кожны ведае, як трэба «правільна» сябе паводзіць, але навошта быць правільным, ужо даўно забыліся. Канфлікт ідзе, бы снежная лавіна. Ён развіваецца настолькі паступова і натуральна, што паходжанне такога напалу цяжка прасачыць. У спрэчцы адкрываюцца ўсе прыхаваныя праблемы герояў. Персанажы перыядычна спрабуюць вярнуцца да прычыны сустрэчы — бойкі паміж іх сынамі, але слоўная бойка, якая ідзе сярод бацькоў, ужо перавышае па сваёй агрэсіі дзіцячыя сутыкненні.

Спачатку сямейныя пары спрабуюць рушыць адзіным фронтам. Мужы і жонкі падтрымліваюць адно аднаго, але толькі да пэўнага моманту: незаўважна для гледача мяжа іх агульных інтарэсаў пройдзеная, і ілюзія шчаслівай сям'і парушаецца. Атрымліваецца, што шлюб — таксама прыгожы фасад, за якім хаваецца непрыгожая рэчаіснасць. Сужэнцы ўжо даўно расчараваліся ў былых каханых, і градус праблемы ўзнімаецца на новы ўзровень. Нечакана разгортваецца і супрацьстаянне палоў, якое не мае дачынення да пытанняў фемінізму: незадаволеныя сваімі мужчынамі жанчыны згадваюць былыя ідэалы мужнасці, а мужчыны, у сваю чаргу, кідаюць фразы пра палкіх каханак, якія не ўмешваюцца ў вырашэнне глабальных праблем чалавецтва.

Адчуваецца татальная адзінота. На першы погляд, у пакоі ідзе размова паміж чатырма дарослымі людзьмі, але ж дыялогу няма: глядач чуе чатыры асобныя ўнутраныя маналогі, якія выпадкова загучалі ўслых. У такіх умовах нельга прыйсці да паразумення: ніхто не шукае кампрамісаў і не спрабуе зразумець апанента. Героі дбаюць толькі пра ўласныя праблемы, зацыкленыя на ўласным эгаізме. Але ці можам мы абвінавачваць гэтых глыбока няшчасных людзей?

Дзея абапіраецца на чацвёрку галоўных герояў, кожны з якіх увасабляе тыя ці іншыя праявы характару сучаснага чалавека. Вераніка — пісьменніца, якая займаецца даследаваннямі канфліктаў у афрыканскім рэгіёне. Яна ідэалістка, хоча падзяліць свет на чорнае і белае, бо гэта значна спрашчае жыццё. Вераніка спрабуе прывесці ўсіх і кожнага да адмысловага стандарту і настойліва імкнецца перайначыць сям'ю Рэяў. Менавіта яна ўвесь час патрабуе ад Фердынанда (сына Анэты і Алена) не проста прабачэння, а адчування раскаяння за свой учынак. Але ж ніхто не можа дыктаваць чалавеку, што трэба адчуваць. Пачуцці — рэч выключна асабістая, і ў выніку Вераніка, якая старанна падаўляе сябе і Мішэля, чыё дзікунства раз-пораз праглядае праз цывілізаваную абалонку, першая (і адзіная сярод герояў) лезе ў сапраўдную бойку са сваім мужам. Мішэль, муж Веранікі, напачатку падаецца найбольш прывабным сярод усёй кампаніі: пагаджаецца з Рэямі, спрабуе ўтрымлівацца ад канфлікту і разраджаць сітуацыю. Калісьці ён нават (вось дзе сапраўдны мужчынскі подзвіг!) гушкаў вазок са сваімі дзецьмі. Але ж і Мішэль не беззаганны. Высвятляецца, што гэты добры і шчыры чалавек, якога так бязлітасна «ганяе» жонка, без дакораў сумлення пазбавіўся ад надакучлівага хамячка — найслабейшага звяна ў сям'і Валонаў. Нерэалізаваныя амбіцыі і прыгнечаны мужчынскі пачатак (калі меркаваць па колькасці матуліных званкоў, Мішэль усё жыццё пражыў пад уладай той ці іншай жанчыны) нарэшце выходзяць з-пад кантролю і абрынаюцца на жонку і гасцей.

Другі мужчына ў п'есе, Ален, здаецца поўнай супрацьлегласцю Мішэля. Гэта паспяховы адвакат, які не расстаецца з мабільным тэлефонам і ставіць працу значна вышэй за сям'ю. Можна здагадацца, што размовы па сотавым у будзённым жыцці Алена адбываюцца часцей за размовы з сынам. Пагадзіцеся, сітуацыя больш як стандартная для постсавецкай прасторы. На нашай глебе стэрэатып аб тым, што сям'я і дзеці — абавязак, які цалкам ляжыць на жанчыне, больш трывалы за тыя ж з'явы ў жыцці еўрапейцаў. Такі стан рэчаў вельмі непакоіць яго жонку Анэту. Анэта першай не вытрымлівае напружання сітуацыі, яна больш «натуральны» чалавек з прысутных. Ад падзей п'есы ёй літаральна хочацца ванітаваць, арганізм жанчыны быццам адмаўляецца засвойваць навакольную крывадушнасць. Немагчыма ўтрымліваць усё пад кантролем, і яна першая выпускае падзеі з-пад сваёй улады. Кульмінацыяй яе незадаволенасці становіцца мабільны тэлефон мужа, які ляціць у вазу з дарагімі кветкамі.

Час ад часу Анэта згадвае эпізод з хамяком Сухарыкам. Небарака з'яўляецца ў сюжэце не проста так: хамяк — своеасаблівы сімвал сучаснага «цывілізаванага» чалавека. Трымаеш яго ў хаце — і ён непакоіцца, шамаціць па начах, выпусціш на вуліцу — і жывёлінка скамянее ад жаху. Хатні гадаванец так даўно сядзіць у клетцы, што ніхто не можа згадаць, дзе знаходзіцца яго першапачатковае жыццёвае асяроддзе. Тут перад гледачамі паўстае пытанне адказнасці. Ці нясе чалавек адказнасць за хамяка, якога спачатку прылашчыў, а потым выпусціў у варожы свет? Глыбей можна ўгледзецца і ў пошукі вінаватага ў канфлікце паміж дзецьмі. Хто адказны за праблемы сучаснага свету, ці можна адназначна падзяліць усіх удзельнікаў канфліктаў на катаў і ахвяр, як хоча Вераніка?

Глабальнасць дзеяння ўнутры дзвюх сямей падкрэслівае і адмысловая сцэнаграфія, створаная Русланам Вашкевічам пры дапамозе відэакантэнту (Сяргей Тарасюк). Над сцэнай бесперапынна паказваюць відэанавіны, дзе распачынаюцца войны і б'юцца палітыкі, а падзеі ў кватэры трансліруюцца бы рэаліці-шоу. Сусветны і прыватны відэарад арганічна дапаўняюць адзін аднаго, выразна ілюструюць, што праблема гвалту і нават тэрарызму зыходзіць з такіх лакальных канфліктаў.

Цікава, што ў фінале Мікалай Пінігін не пераносіць канфлікт п'есы на беларускую глебу, не спрабуе зрабіць яго больш зразумелым айчыннаму гледачу, а дадае сцэну з мігрантамі, якой у арыгінальным сцэнарыі не было. Як зазначыў мастацкі кіраўнік Купалаўскага падчас сустрэчы з журналістамі, Беларусь — гэта таксама Еўропа. І таму ў завяршэнні спектакля пад назвай «Талерантнасць» мы бачым, як былыя гаспадары прыгожага цывілізаванага пакоя прыслужваюць мусульманскай сям'і: пакуль людзі трымаюць у сабе незадаволенасць жыццём і марнуюць унутраную энергію на тое, каб схаваць рэальныя жаданні і пачуцці, у іх не хопіць моцы супрацьстаяць знешняй агрэсіі. Але надзея ёсць: у сцэнічнай кватэры парушаецца прынятая раней цішыня, і героі пачынаюць агучваць сваю рэчаіснасць.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

Асаблівы Дастаеўскі

3D-спектакль ад інклюзіўнага тэатра

Апавяданне Ф. М. Дастаеўскага «Хлопчык у Хрыста на ёлцы» стала падставай для стварэння спектакля, прымеркаванага да Дня абароны дзяцей. Але пакажуць яго 28 мая на сцэне Рэспубліканскага палаца культуры прафсаюзаў. І прыглядзецца варта: пастаноўку рыхтуе Сямейны інклюзія-тэатр «і», дзякуючы якому Дастаеўскі загучыць са сцэны па-беларуску. Па-беларуску іграюць яго акцёры, сярод якіх — дзеці з аўтызмам. У гэтым асаблівасць інклюзіўнага тэатра, які выходзіць за межы мастацкай практыкі, а набывае значэнне як сацыяльны праект. Агульная колькасць меркаваных удзельнікаў — больш за 100 чалавек.

Тэатр сапраўды дае магчымасць яднання для розных людзей — і тых, што на сцэне, і тых, што ў зале, прычым не толькі малых.

Сам спектакль разлічаны ў першую чаргу на дарослага гледача: падымае пытанні свабоды выбару, няроўнасці, веры ў справядлівасць. Але хто сказаў, што дзеці не адчуваюць гэтых тэм? Гледачамі могуць стаць малыя нават ад 3 гадоў: яны пабачаць казку з адмысловым сцэнічным афармленнем, дзе выкарыстаны 3D-тэхналогіі, з дапамогай якіх створаныя аб'ёмныя праекцыі пярэдняга і задняга планаў. Далёка не кожны рэпертуарны тэатр выкарыстоўвае сёння падобныя тэхналогіі. Але ў гэтай казцы адбываецца столькі неверагоднага, што і паказваць яе падзеі можна толькі з дапамогай сучасных цудаў тэхнікі: хлопчык, што застаўся без бацькоў перад Калядамі, адзін у вялікім горадзе, далучаецца да чароўнага свята — трапляе на ёлку да Ісуса Хрыста і анёлаў… Цуды здараюцца і ў наш час: маленькім артыстам, бацькам і самому сямейнаму тэатру аказаў падтрымку аператар *velcom*. «Мы спадзяёмся звярнуць увагу на праблему ўспрымання асаблівых людзей у грамадстве, — адзначыў начальнік аддзела карпаратыўных камунікацый кампаніі *velcom* Вячаслаў Смірноў. — Гэта будзе ўжо пятая за два гады пастаноўка гэтага тэатра, які распрацаваў і ўвасабляе ў жыццё ўнікальную методыку сацыялізацыі асаблівых дзяцей, якая не мае аналагаў у свеце. І цяпер ужо практычна немагчыма адрозніць асаблівых і звычайных акцёраў на сцэне».

Марыя АСІПЕНКА

ТРАНСФАРМАЦЫЯ СВЕТУ

Чаму вучыць французская «МІСІС ХАЙД»?

Пакуль погляды кінааматараў свету прыцягнуў славуты Канскі фестываль, мы прапануем шукаць Францыю ў беларускіх кінатэатрах. У межах праекта «Лістапад. Калекцыя» фільм «Місіс Хайд» прадставіў сам рэжысёр Серж Базон. Выключны выпадак, але ён стаў магчымы дзякуючы Пасольству Францыі ў Беларусі.

Серж Базон — знакавая фігура ў французскім кіно. Ён адносіцца да той плеяды французскіх аўтараў (пад уплывам «новай хвалі»), якія працуюць у малабюджэтным кінематографе, каб прадставіць аўтарскі погляд і распрацаваць уласны стыль. У 26 гадоў зняў свой першы поўнаметражны фільм «Сяброўства» за ўласныя грошы на працягу дзевяці дзён. Творчы калектыў, які складаўся з сяброў рэжысёра, працаваў бясплатна, а сам рэжысёр выканаў галоўную ролю…

На сёння Базон зняўся ў 47 фільмах і эпізодах як акцёр, рэжысёр сямі фільмаў, кінакрытык (вядзе пастаянную калонку ў французскім часопісе), сцэнарыст, нават называе сябе ды-джэем.

«Місіс Хайд» — гэта фантазійная інтэрпрэтацыя Сержа Базона на гісторыю Роберта Стывенсана «Дзіўная гісторыя містара Жэкіля і доктара Хайда». Карціна ўдзельнічала на фестывалі ў Лакарне.

Галоўная гераіня — сарамлівая настаўніца фізікі місіс Жэкіль. У яе склалася няўдалая кар'ера, яе ніхто не паважае і не ўспрымае ўсур'ёз. Яна спрабуе мяняць свае педагагічныя метады, але вынікі не заўважныя. Мы знаёмімся з ёй у перыяд, калі змяніць нешта ўжо немагчыма. Пераўтварэнне можа адбыцца толькі з дапамогай чагосьці, напрыклад, звышнатуральнага. У пэўны момант у яе б'е маланка падчас чырвонага месяца. І яна становіцца ледзь не супергероем.

Яна доўгі час не разумее, у каго пераўтвараецца ноччу, а пасля бачыць надпісы на люстэрках. Паступова ў яе закрадваюцца сумневы і страхі — і ўсё пачынае разбурацца. І яна паступова губляе свае сілы. Уся цёмная энергія ў светлавой абалонцы знікае пасля ўсведамлення негатыўных эфектаў (напрыклад, забойстваў), якія яна нясе ў жыцці для іншых…

Галоўную ролю ў фільме сыграла Ізабэль Юпер — адна з самых паспяховых французскіх акцёрак, якая мае мноства разнастайных еўрапейскіх і сусветных узнагарод, нават намінацыю на Оскар.

Серж Базон вырашыў змяніць тактыку падачы ігры актрысы: «Гэтая роля пісалася адмыслова для яе, гэтак жа як і роль у "Тып-топе". Справа ў тым, што ёй часта дастаюцца ролі халодных і ўладных жанчын. Але, мне здаецца, гэта несправядлівы лад. У фільме "Тып-топ" я яго давёў да крайняй кропкі — ступень нястрымнасці. Яна ўсё біла і разбурала. Аднак гэтыя парывы не прыводзілі гледача да псіхааналізу, што з героем здарылася, што прывяло яго да такога стану. Ніхто не будзе думаць пра тое, што гэтыя паводзіны звязаныя з псіхалагічнымі траўмамі. У "Місіс Хайд" першапачаткова планавалася іншая Ізабэль. Мне не хацелася зноў паказваць яе ў вобразе ўладнай жанчыны. Ізабэль вельмі шмат прыўнесла ў гэты фільм. Яна не імправізавала, але спрабавала знайсці ў сваёй ігры нешта такое, што я сам не чакаў і тым больш не патрабаваў ад яе».

Гэтак жа галоўную ролю ў гэтай сацыяльнай трагікамедыі можна прысвоіць і аднаму з непаслухмяных вучняў у зусім недысцыплінаваным класе. Яго завуць Малік і ён пакутуе на ДЦП. У класе ён такі ж адшчапенец, як і настаўніца сярод ліцэйскай выкладчыцкай эліты. Аднак, нягледзячы на іх падабенства, ён ставіцца да яе з такім жа негатывам. Як і астатнія, спрабуе самасцвердзіцца за яе кошт і ўліцца ў школьны калектыў. Усё ж місіс Жэкіль прыдумляе спосаб заняць яго навуковай дзейнасцю.

Ізабэль Юпер у фільме «Місіс Хайд».

Цікава, што ліцэйскі клас прызнаны фізіка-тэхнічным, які складаюцца пераважна з насельнікаў праблемных кварталаў. Гэта падлеткі з няшчасных сем'яў або дзеці мігрантаў, пераважна арабаў і афрыканцаў, якія не хочуць вучыцца, затое з задавальненнем чытаюць рэп. Серж патлумачыў, што некаторы час ён сам жыў у такім квартале, дзе няма беласкурых прадстаўнікоў: «Гэта тая рэальнасць, пра якую я хацеў расказаць. У маім папярэднім фільме "Тып-топ" я ўжо закранаў тэму складаных кварталаў, тэму расізму. Але ў іншых фільмах, якія я рабіў раней, гэтую тэматыку не закранаў. На той момант мяне гэта не вельмі цікавіла. Магчыма, я быў больш бесклапотны ў той час. Фільмы атрымліваліся мяккія і цякучыя, было менш перапынкаў у танальнасці».

Фільм здымаўся на стужцы ў 35 міліметраў. Гэты прыём быў спосабам змагацца з лічбавым фарматам. Бо лічбавыя здымкі прыводзяць да манахромнасці карціны. Напрыклад, вельмі папулярны французскі фільм «Боль», мае манахромную карцінку, аддаючы шэрым металікам. Амерыканскія стужкі таксама досыць манахромныя. Колеракарэкцыя фільма не дапамагае дасягнуць лепшага выніку, як напрыклад, плёнка: «Вынік, які я атрымаю, не будзе манахромны — тыя ж колеры, якія я прыкладна бачу цяпер перад сабой. Мы не спрабавалі зрабіць нешта натуральнае або надаць эфект дакументальнасці. Ідэя была ў тым, каб паказаць, што мы праходзім праз нешта штучнае, але не для таго, каб пазбегнуць рэальнасці, а каб пагаварыць аб гэтай рэальнасці з іншага пункту гледжання. Магчыма, больш прама, сумленна і адкрыта, чым у фільмах, якія зняты з ідэяй паказаць усё гэта рэалістычна», — адзначыў Серж Базон.

…Фільм заканчваецца гісторыяй Маліка, якога місіс Жэкіль зацікавіла навукай. Найгоршы вучань у класе прайшоў трансфармацыю. Яна апякла яго цела (хоць і ўсе гледачы чакалі, што ён памрэ), але перадала яму свае веды. У новай школе ён не скардзіцца на выкладчыка, а абараняе і нават аддае ёй хвалу. Бо тое, што яна змагла яму перадаць, значна важнейшае за яго сапсаваную знешнасць. Аднак праменьчык надзеі забіты. Новаму класу абыякавыя яго імкненні да навукі, яны смяюцца з яго, як над Місіс Жэкіль у самых пачатковых сцэнах фільма. Гэты цыкл даволі драматычны. І новы настаўнік таксама няўважліва слухае, робіць сухія заўвагі. Можна заўважыць, што Малік застаўся ў адзіноце са сваім лістком каля дошкі. Атрымліваецца, што місіс Жэкіль перадала не толькі святло ведаў, але і цені ў яе душы. Ён становіцца ёю.

Кінастужка раскрывае заганы сучаснай сістэмы адукацыі: снабізм і сухасць настаўнікаў, жудасная жорсткасць падлеткаў, якія не жадаюць атрымліваць новыя веды, якія спатрэбяцца ім у жыцці. Немагчымасць знайсці кампраміс гэтых бакоў і ў цэлым жаданне пакінуць усё, як ёсць. Школа павінна навучыць думаць і аналізаваць, а не прымушаць зубрыць кнігі і ўвесь час даваць гатовую інфармацыю. Карціна актуальная не толькі для Францыі, але і ўсяго свету.

Сам Серж Базон вельмі хацеў, каб гледачы зразумелі галоўны яго пасыл: «У мяне няма нейкіх універсальных рэцэптаў, з якімі я б мог дапамагчы місіс Жэкіль у яе цяжкасці. Я не спрабую перадаць жыццёвы ўрок або правілы паводзінаў. Для мяне важней за ўсё перадаць эстэтычныя эмоцыі, нешта, што прымусіць вас выпрабаваць галавакружныя пачуцці і задумацца над сітуацыямі ў навакольным свеце. Калі ў вас паўстала адчуванне абрыву, занепакоенасці або недаказанасці, я рады гэтаму больш, чым фразе "я вынес для сябе нейкі ўрок жыцця"».

Селіна ЧАРНОВА

Тры пытанні па-за сеансам

Не толькі адзін фільм, але наогул кіно былі тэмай для размовы з Сержам Базонам.

— Як кіно ўвайшло ў ваша жыццё?

— Я хацеў стаць рэжысёрам з дзяцінства. Калі быў у пачатковай школе, то рыхтаваў апавяданні пра творчасць Гадара. Але на той момант я бачыў толькі два яго фільмы. Жыў у Руане, невялікім правінцыйным гарадку, і чытаў пра яго шмат кніг. І так атрымалася, што мы з сястрой, якая потым стала аператарам, шмат хадзілі ў кіно. Я не вучыўся на рэжысёра, акрамя таго, я супраць навучання кінематографу. Магчыма, гэта карысна, калі справа датычыцца тэхнічнага боку. Напрыклад, мая сястра вучылася, каб спасцігнуць тэхніку работы са святлом. Але калі хочаш стаць рэжысёрам, то што можа прынесці вучоба? Не трэба хадзіць у школу ці ўніверсітэт, каб пісаць рок-песні. Тое ж самае і з кіно. Жан Както казаў, што той, хто хоча займацца кіно, павінен займацца дзве гадзіны. Яшчэ адзін прыклад — Жан П'ер Макі, якога я вельмі люблю. Ён стварыў каля 100 фільмаў (больш за шэсцьдзясят мастацкіх і сорак эпізодаў тэлевізійных серыялаў). Пастаянна нешта здымае. І калі папрысутнічаць на яго здымках, можна заўважыць, што ён зусім не разбіраецца ў тэхнічным баку кінематографа: нават не ведае, на якую кнопку націснуць.

— Вы пайшлі па шляху знакамітай французскай «новай хвалі» — праз прафесію кінакрытыка ў рэжысуру?

— Так, але гэта не значыць, што кінакрытыка — п'едэстал, на які можна ўстаць і трапіць у кіно. У прафесіі яна мне моцна дапамагла. Такім чынам атрымліваецца зразумець, што ты любіш, што падабаецца. Нельга казаць, што кінакрытыка — гэта нейкі этап у жыцці. Мне здаецца, тэксты, якія я пішу цяпер, лепшыя, чым тыя, што пісаў раней. Таму што цяпер бачу рэчы значна шырэй. П'ер Леон, які бываў у вас у краіне, таксама займаўся кінакрытыкай. Мая жонка Паскаль таксама піша як кінакрытык. Але яна любіць толькі сталінскія фільмы. Кінакрытыка, безумоўна, дапамагае. Але ў мяне з'явіліся ворагі з-за гэтага.

— Ваш фільм крыху нагадвае Рамана Паланскі і яго кінастужку «Дзіця Размары». Ці абапіраліся на работы гэтага рэжысёра?

— Я глядзеў названы фільм, калі быў малады. Мне падабаюцца і іншыя яго фільмы. Раман абсалютна віртуозны як рэжысёр, працуе ў новахічхокаўскім стылі «трылер». Шмат падвешаных момантаў, асабліва ў развіцці сюжэта. Не спрабую гэта паўтарыць. Прызнаю, што мае фільмы не такія вялікія і менш прафесійныя, чым яго. Напрыклад, у маім фільме менш момантаў, якія прымусяць спалохацца і характэрны для трылеру. Усе фантастычныя сцэны ў «Місіс Хайд» — сцэны пераходу з аднаго свету ў іншы. Гэта не зусім дзеянне або сутыкненне. Паланскі не з Галіўду, але ён больш належыць да гэтага асяроддзя. Мне бліжэйшыя савецкія рэжысёры. Напрыклад, Барыс Барнет. Ён любіў змешваць розныя танальнасці. Не створана адчуванне, што ў яго фільме выразна прапрацаваны сцэнарый. У яго фільмах шмат лірыкі, пяшчоты. Рэжысёр абсалютна адмаўляецца ад чагосьці непраўдападобнага. У фільмаў сціплы бюджэт. У іх няма гладкасці прафесійных, выразна прапрацаваных фільмаў. І здаецца, што многае знята дзякуючы збегу выпадкаў. Таму нас увесь час здзіўляе, што адбываецца. Ён не спрабуе гуляць з падвешаным станам гледача. Гэтае кіно больш паэтычнае, чым дзейснае.

АРГАНічнасць паразумення

Унікальная падзея ў культурным жыцці нашай краіны — з'яўленне першага беларускага арганнага дуэта. Юры Габрусь і Варвара Царук паасобку маюць шмат дасягненняў у музыцы. Юры скончыў Акадэмію музыкі і тэатра Гётэборгскага ўніверсітэта па спецыяльнасці «Царкоўная музыка і арган». Па праграме абмену вучыўся ў Акадэміі мастацтваў у Брэмене, дзе авалодваў арганным выканальніцтвам пад кіраўніцтвам знакамітага прафесара доктара Ханса Давідсана і Рудольфа Кельбэра, вучыўся арганнай імправізацыі ў арганіста-віртуоза прафесара Крыстофа Громана. Варвара скончыла Беларускаю дзяржаўную акадэмію музыкі па спецыяльнасцях «Музыказнаўства» і «Арган». Яна актыўны ўдзельнік арганных акадэмій і майстар-класаў у Германіі і Аўстрыі. Больш за паўгода таму Юры і Варвара аб'ядналіся, каб знаёміць публіку з сачыненнямі, якія сольна на аргане сыграць амаль немагчыма.

— Звычайна для таго, каб граць на аргане, трэба прайсці фартэпіянную школу. Якім быў ваш шлях да аргана?

Юры: Насамрэч для таго, каб граць на аргане, неабавязкова праходзіць праз кафедру спецыяльнага фартэпіяна. Зразумела, трэба ведаць клавірную тэхніку і валодаць фартэпіяна. На гэтым інструменце я граю з шасці гадоў. Але ніколі нават і не думаў звязваць жыццё з музыкай прафесійна. У мяне было прадузятае меркаванне, што трэба абавязкова праходзіць нейкія ступені: паступіць у Акадэмію музыкі, стаць выдатным піяністам, а толькі потым — арганістам. На той момант, калі мне патрэбна было выбіраць універсітэт, у нас яшчэ не было нават спецыяльнасці, дзе навучалі арганістаў. Да таго, як я звязаў жыццё з музыкай, адвучыўся на хіміка-арганіка, быў вучоным і працаваў у Акадэміі навук. А потым праз уласнае захапленне, пачаў граць на аргане.

Варвара: Я з дзяцінства марыла граць на аргане, але доўгія гады не магла да яго дабрацца. У музычнай школе, дзе я вучылася і з шасці гадоў грала на фартэпіяна, быў арган, але ў непрацоўным стане. Я думала, что насамрэч ён працуе, а мяне проста да яго не пускаюць. Ды паабяцалі, што я буду граць на аргане, калі вырасту. У музычным вучылішчы я вывучала музыказнаўства, па гэтай жа спецыяльнасці вучылася і ў Акадэміі музыкі. Там і пачала граць на аргане.

— Як і калі вы сталі разам за адзін інструмент?

Юры: Мы абое працуем у Дзяржаўным камерным хоры. Я прыйшоў у хор раней за Вару. Запрасіла кіраўнік хору Наталля Міхайлава, і я пачаў супрацоўнічаць з гэтым калектывам як арганіст. Наш першы сумесны канцэрт з хорам адбыўся ў Ракаве. У дадатак да гэтага я яшчэ і пяю. Таму мяне ўзялі ў штат Дзяржаўнага камернага хору. Сумяшчаў ігру на аргане і вакал. А потым прыйшла Варвара як лектар-музыказнаўца і арганіст. Вось і выкарысталі магчымасць граць разам.

Арганны дуэт наогул нераспаўсюджаная з'ява. Але ёсць вопыт арганістаў у іншых краінах. У Беларусі ў Акадэміі музыкі таксама можна было сустрэць арганныя дуэты: старэйшае пакаленне вучняў У. Неўдаха выконвала некалькі ансамблевых п'ес на аргане. Але гэтая практыка не атрымала распаўсюджання.

— Выконваеце пераладжэнні твораў ці ёсць сачыненні, напісаныя спецыяльна для дуэта арганістаў?

Юры: Рэпертуарных ансамбляў, якія напісаны спецыяльна для аргана, няшмат. Часта арганны дуэт перакрываецца рэпертуарам для двух клавіраў. Напрыклад, творы Моцарта і Гайдна можна выконваць на аргане. Таксама італьяскае барока ў музыцы шмат увагі ўдзяляла арганнаму ансамблю. Таму што італьянскія саборы былі вялікія, а арганы — маленькія, і ў адным храме ставілі некалькі інструментаў. У Італіі некаторы час арганная музыка знаходзілася пад уплывам оперы. Выкарыстоўваліся тэмы Вердзі і Расіні, п'есы аб'ядноўваліся і выконваліся на двух інструментах. Таксама ёсць пераклады сімфанічных твораў для аргана. Часта іх робяць піяністы. Але фартэпіяна не можа перадаць адценні і фарбы аркестра, і слухач павінен дадумваць сам. Арган бліжэй да гучання аркестра.

— У храмах публіка не бачыць арганістаў, бо інструмент размяшчаецца на балконе. Ці можна на слых зразумець, што за арганам менавіта дуэт, а не адзін музыкант?

Юры: Так, гэта магчыма. У нас быў досвед, калі мы гралі адразу на ўсіх клавіятурах аргана — у аднаго чалавека не атрымалася б. Калі ў разгорнутых партыях задзейнічаны 3—4 клавіятуры з педалямі, то зразумела, што грае не адзін чалавек. Але слухачу, які прафесійна з музыкай не звязаны, напэўна, адрозніць будзе цяжка. Калі ў інструмента ёсць стэрэагучанне, то па колькасці галасоў, тэмбраў і фарбаў можна здагадацца аб тым, што граюць два арганы. Але ёсць такія творы, у якіх мэта кампазітара была, наадварот, у тым, каб аб'яднаць партыі, зрабіць пераход партый выканаўцаў незаўважным. Ёсць розніца: твор для двух арганаў ці для двух арганістаў за адным інструментам. У апошнім выпадку няма мэты, каб усе разумелі, што грае не адзін чалавек. Мы граем удваіх, каб сыграць складаныя творы, якія адзін чалавек выканаць не зможа.

— Якія творы вы абралі для канцэрта, што адбыўся 16 мая ў Чырвоным касцёле?

Юры: Наша праграма ахоплівае шырокі дыяпазон эпох. Першапачаткова рэпертуар складаўся з п'ес для механічнага аргана. То-бок, з тых п'ес, якія былі напісаны ў сярэдзіне XVIII стагоддзя кампазітарамі венскай школы: Бетховенам, Моцартам, Гайднам. Фактычна яны былі прызначаны для аргана. Калі не зрабіць адаптацыю, то тэхнічна аднаму чалавеку іх выканаць немагчыма. Яны ідэальныя для выканання арганістамі ў чатыры рукі. Асноўны твор нашай праграмы — Саната Меркеля Рэ мінор для двух арганістаў. Выконваем п'есу кампазітара XVI стагоддзя Арнольда Шліка — асаблівасць у тым, што гэта адзіны за апошнія 500 гадоў твор, напісаны для дзесяці галасоў. Часам яго спрабуе выканаць адзін арганіст, але тэхнічна гэта вельмі складана і практычна немагчыма. Мы вырашылі, што можна выканаць твор у перакладзе для двух арганістаў. Гэта прэм'ера ў нашай краіне. Я не памятаю, каб імя Шліка гучала на канцэртных пляцоўках Беларусі. Прагучалі «Фантазіі» Гёсэ. Таксама выконваем пераклад Баха. Ён зрабіў яго на канцэрт прынца Саксонска-Веймарскага, які быў яшчэ і кампазітарам. Бах прапанаваў дзве версіі: адну — для аргана, дзе пераклаў толькі трэцюю частку; другая версія — пераклад усіх трох частак для клавіра. Арганную версію выконваем у перакладзе сучаснага італьянскага кампазітара Маўрыцыа Макела.

— Колькі часу вам спатрэбілася, каб сыграцца?

Варвара: Упершыню дуэтам мы гралі ў лістападзе мінулага года. Шмат займаемся. У залежнасці ад складанасці можам займацца разам ці самастойна: чым больш складаная п'еса, тым лепш яе вучыць разам. А калі п'еса простая, лепш паасобку, а разам потым граць.

Юры: Напачатку былі моманты лёгкага недаверу. Мы гралі, рэпеціравалі, а падчас канцэрта адчувалі стрэс і хваляваліся. Але знайшлі паразуменне, і цяпер узаемадзейнічаем лёгка і арганічна.

Юлія КАРДАШ

Не прамініце!

Сюіта для двух фартэпіяна

Піяністы Кірыл Кедук і Андрэй Паначэўны ўпершыню сыграюць разам. У гонар Рахманінава.

Зоркі сышліся: дзеля канцэрта да 145-годдзя Сяргея Рахманінава ў вялікай зале Белдзяржфілармоніі дадому прыязджаюць нашы сусветна вядомыя піяністы Кірыл Кедук і Андрэй Паначэўны, каб выступіць у адным канцэрце 19 мая. Яркія піяністы, для якіх адкрытыя канцэртныя пляцоўкі краін Еўропы, Амерыкі, Азіі, сустрэча з кожным з іх — падарунак для гледача. Для айчыннага цяпер — двойчы падарунак: супалі графікі музыкантаў, якія актыўна ездзяць з канцэртамі па свеце.

Андрэй Паначэўны, уладальнік Бронзавага медаля XII Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага (2002) і найвышэйшых узнагарод шэрагу міжнародных конкурсаў піяністаў, музыкант, які мае нават званне «Выбітнага артыста Кітая» (за 2009 і 2011 гады), цяпер жыве ў ЗША.

Кірыл Кедук, пераможца конкурсу Уладзіміра Гаравіца і лаўрэат 15 міжнародных конкурсаў, таксама ўвесь час у руху, выступае з канцэртамі на прэстыжных пляцоўках, сярод якіх Нью-Ёркскі *Steinway Hall*, Зальцбургскі Моцартэум, Вялікая зала Маскоўскай кансерваторыі, зала Каралевы Лізаветы ў Антвэрпэне… Праўда, на радзіме — у Гродне — ён стварыў міжнародны фестываль музыкі «*TyzenHouse*» і не губляе магчымасці для сустрэчы з пулікай у розных гарадах Беларусі (няма маленькіх і няважных, бо паўсюль жывуць людзі!), ён быў удзельнікам асобных тураў па краіне разам з іншымі нашымі славутымі музыкантамі, такімі як віяланчэліст Іван Карызна і скрыпач Арцём Шышкоў.

Але іх шляхі з Андрэем Паначэўным пакуль не перакрыжоўваліся ў адным канцэрце. Сустрэча тым больш адметная, што нагодай для яе стала магчымасць іграць творы Сяргея Рахманінава, які сам быў геніяльным піяністам. Праграма канцэрта ўключае прэлюдыі, элегіі, п'есы-фантазіі для фартэпіяна, прагучыць *Andante* з віяланчэльнай санаты ў адмысловым пераладжэнні для фартэпіяна Аркадзя Валадося. Гэта будзе ўсё ж не проста канцэрт, у якім выступяць два славутыя піяністы, але Кірыл Кедук і Андрэй Паначэўны выканаюць разам сюіту для двух фартэпіяна.

Арганізатарам канцэрта стаў Музычны дом «Класіка», які выкарыстаў цудоўнае спалучэнне: юбілейную дату кампазітара Сяргея Рахманінава (у гонар якога сёлета ладзяцца канцэрты па ўсім свеце) і магчымасць двух выдатных беларускіх піяністаў выступіць разам у адзін дзень.

Марыя АСІПЕНКА

Сілуэты Спадчыны

Аўтарскі праект Уладзіміра Цвіркі

СТРЭШЫН

Якімі б цудоўнымі ні былі здымкі таго ці іншага архітэктурнага помніка, прыехаць і ўбачыць іх на свае вочы — зусім іншая справа. Пастаяць побач, дакрануцца, абысці з усіх бакоў, нават падыхаць паветрам, якое ахінае збудаванні… Магу вас запэўніць: паветра рознае. Паветра, сцены ды нейкія асабістыя пахі гэтай мясціны робяць цуд і міжволі акунаюць, зацягваюць у далёкае мінулае. Здараецца падобнае са мной не заўсёды, але вельмі часта. Вось калі падыходзіў да царквы ў гарадскім пасёлку Стрэшын Жлобінскага раёна, падалося, што вось-вось пераступлю нейкую нябачную рысу, мяжу і апынуся ў…

Калі верыць даследчыкам мінуўшчыны, легендарны горад Стрэжаў (сённяшні Стрэшын) існаваў ужо ў 1127 годзе, а ў 1391-м вялікі князь Вітаўт падарыў паселішча віленскаму біскупству. Пачынаючы з XV ст. Стрэшын ведалі далёка за межамі гэтых зямель як развітое гандлёвае мястэчка Падняпроўя ў складзе ВКЛ. Паводле гістарычных даведак, з пачатку XVII ст. у Стрэшыне і яго прадмесцях налічвалася каля паўсотні двароў, драўляны замак, былі корчмы, паветраныя і вадзяныя млыны. Побач, на беразе Дняпра, існавала вялікая сядзіба з броварам, дзейнічалі царква і каталіцкі храм, працавала паромная пераправа праз Днепр, ладзіліся шматлікія кірмашы.

Праўда, ад Стрэшынскага замка, на жаль, нічога не засталося. Драўляныя вежы ды абарончыя сцены незваротна і не адзін раз знікалі ў полымі падчас захопніцкіх нападаў чужынцаў. Нават земляныя валы вышынёй да 15 метраў, ды глыбокія ірвы, запоўненыя вадой з Дняпра і рэчкі Стрэшанкі, таксама з цягам часу былі сцёртыя з твару зямлі. Сёння толькі мемарыяльны камень у невялічкім парку на беразе Дняпра, на месцы замчышча ці гарадзішча, сціпла паведамляе, што тут у канцы XVIII ст. яшчэ велічна ўздымаўся драўляны Стрэшынскі волат.

Мабыць, дзякуючы менавіта Стрэшынскаму пяцівежаваму абаронцу пад яго высачэзнымі сценамі з'явілася спачатку невялічкае паселішча, якое перарасло ў мястэчка, а потым — і ў горад Вялікага Княства Літоўскага, што пазначаны на старадаўніх картах. Знаходзячыся на памежных землях Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай, замак не раз апынаўся ў самым пекле ваенных дзеянняў. На працягу больш як сямі стагоддзяў (з XII па XVIII) ён стойка абараняў рубяжы нашай Бацькаўшчыны.

Росквітам ды багаццем горад вабіў сквапных суседзяў. Неаднойчы пад сценамі зам-ка з'яўляліся войскі ворагаў. Так, падчас страшэннай вайны з Масковіяй (1654—1667), якую называюць «крывавым патопам», замак і горад былі спаленыя дашчэнту казацкімі войскамі пад кіраўніцтвам І. Залатарэнкі. Як вядома, у гэтай вайне загінуў кожны другі жыхар нашай зямлі. Але, нягледзячы на такія разбурэнні, жыхары зноў паднялі мястэчка з попелу і адбудавалі горад ды замак, які прастаяў да канца XVIII ст.

Сёння вуліцы Стрэшына дзе-нідзе паўтараюць гістарычную забудову. Галоўная вуліца супадае са старажытным трактам, які ішоў з Горваля на Рагачоў. А ўпрыгожвае горад і яго наваколле ўзведзеная ў класічным стылі Пакроўская царква, якая стаіць на магутным падмурку з 1807 года. Каб даведацца, да якой канфесіі першапачаткова адносіўся храм, неабходна звярнуцца да гісторыкаў. І абавязкова трэба зазначыць, што перад намі вельмі рэдкі ўзор цэнтрычнай культавай пабудовы.

Асноўнае ўпрыгожванне храма — вежачкі-ратонды, размешчаныя па кутах асноўнага памяшкання царквы. На кутах будынка — сціплыя паўкруглыя апсіды пад невялічкімі купаламі. А больш за ўсё мне спадабаліся тры ўваходы ў святыню, аздобленыя вельмі выразнымі мураванымі ганкамі. Адразу адчуваецца гасціннасць храма, яго адкрытасць і ўтульнасць для ўсіх, хто прыходзіць сюды. Яшчэ адна прыемная акалічнасць: літаральна ўсюды кветкі. Ружы розных адценняў бяруць у палон белыя сцены святыні, лашчацца да іх, як малыя дзеці да матулі.

Зноў жа згадаю, што здымкі, нават самыя таленавітыя, не перададуць эмоцый, якія поўняць побач з храмам… Трэба ехаць, ісці да такіх архітэктурных цудаў, каб хоць крыху пабыць побач з імі, зайсці пад іх скляпенні, хоць трошачкі адчуць подых нашай велічнай гісторыі.

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Тацяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
17.05.2018 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 1347

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 1779

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.